ШЛЯХЕЦКІЯ СЮЖЭТЫ СУЧАСНАГА АЙЧЫННАГА КІНО 8

ПЛАВАННЕ — СПОРТ АДУКАВАНЫХ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 2020 г. СУБОТА № 56 (29170)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Электрамабілі стануць для грамадзян нашмат таннейшыя. Разлікі паказваюць, што з улікам ільгот і абнулення мытных пошлін эканомія пры куплі і эксплуатацыі новага электрамабіля можа скласці ад 15 тысяч да 30 тысяч рублёў, у залежнасці ад маркі. Важна адзначыць, што льготы датычацца і аўтамабіляў з прабегам. Мы хочам павысіць прывабнасць электрамабіляў для грамадзян і ўпэўненыя, што рост іх колькасці, у сваю чаргу, будзе спрыяць развіццю інфраструктуры».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Для вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі задзейнічаць беларускія прадпрыемствы»

Аляксандр Лукашэнка наведаў навукова-вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «АДАНІ»

Як захаваць баланс інтарэсаў дзяржавы і бізнесу праз падаткі і льготы? Як стварыць высокатэхналагічную вытворчасць? Чаму сацыяльная накіраванасць — найлепшы рухавік справы? Чаму проста замясціць імпарт копіямі недастаткова? Дыялог зацікаўленых бакоў адбыўся ў самым «жыццёвым» фармаце, на прадпрыемстве, пад гул 3D-прынтара.

Фота БелТА

СЭЗ І МЭТА

Аляксандр Лукашэнка падрабязна пацікавіўся парадкам падаткаабкладання рэзідэнтаў СЭЗ «Мінск», на якой размешчана ў тым ліку і АДАНІ. Прэзідэнта праінфармавалі, што гэтыя прадпрыемствы не плацяць падатак на прыбытак, — згодна з новай рэдакцыяй Падатковага кодэкса, рэзідэнты вызваленыя ад гэтага абавязку да 2050 года на ўвесь перыяд дзейнасці ў свабоднай эканамічнай зоне пры ўмове экспарту прадукцыі ці продажу іншаму рэзідэнту. Па ўсіх СЭЗах краіны аб'ём экспарту складае 65 працэнтаў. АДАНІ экспартуе 80—85 працэнтаў прадукцыі. Дарэчы, летась усе рэзідэнты СЭЗ заплацілі 1,3 мільярда рублёў падаткаў, а льгот атрымалі на 900 мільёнаў.

СТАР. 2

Рэпарцёры атрымалі заданне...

...КУПІЦЬ МАСКУ Ў АПТЭЦЫ

Наколькі проста і пачым можна набыць актуальны на сённяшні дзень атрыбут?

Апошнім часам медыцынская маска стала паўнавартасным аксесуарам і, магчыма, неабходнай рэччу, якую абавязкова трэба захапіць акрамя ключоў і тэлефона, калі зранку выходзіш з дому. Канешне, можна доўга спрачацца наконт іх эфектыўнасці і мэтазгоднасці, але попыт расце і ён павінен быць задаволены ў поўнай меры. Прынамсі, такая задача неаднойчы ставілася на найвышэйшым узроўні. Нашы карэспандэнты ў Мінску і Віцебску атрымалі заданне высветліць, ці проста купіць маскі ў аптэках.

Журналіст «Звязды» прагуляўся па цэнтральных вуліцах Віцебска і завітаў у аптэкі і «пункты лекаў», размешчаныя ў папулярных сярод гараджан і гасцей горада гандлёвых цэнтрах.

Калі казаць шчыра: ці патрэбны маскі ўсім? Не! У першую чаргу — хворым, каб не заразілі іншых, ды здаровым, якія знаходзяцца ў памяшканнях. На свежым паветры інфекцыю «падчапіць» немагчыма, сцвярджаюць медыкі.

Дарэчы, на вуліцы мінакоў, якія былі ў масках, аўтар гэтых радкоў за дзве гадзіны налічыў чалавек пяць, і большасць з іх — мужчыны...

Жарты пры знаёмстве з дзяўчатамі і дамамі, якія праходзілі міма, наконт таго, дзе яны купілі такую прыгажосць на твары, успрымаліся са смехам. Вірус вірусам, а жыццё ж працягваецца. Тым больш што вясна набірае моц. Так што панікі, страху заразіцца аўтар падчас прагулкі не адчуў.

У пачатку «марафону» зайшоў у аптэку ў гіпермаркеце, які побач з «МакДональдсам». Гэта недалёка ад, бадай, самых вядомых віцебскіх спальных мікрараёнаў пад агульнай назвай Білева. Прыдумаў легенду — маўляў, строгая начальніца дала даручэнне купіць калектыву аддзела маскі. І пажадана, канешне, знайсці танныя. Фармацэўт адказала, што, на жаль, танных мне прапанаваць не можа, бо па 50 і 70 капеек раскупілі даўно. Але так званую шматразовую за 1 рубель 45 капеек купіць нават больш выгадна. Так, трэба праз дзве-тры гадзіны замяніць. Але, калі ўзяць для разліку працягласць рабочага дня з перапынкам, дык пяці масак хопіць. А далей — дома памыў, адпрасаваў і нацягвай зноў.

СТАР. 4

КАРАТКА

- **Указам Прэзідэнта адменены састарэлыя і ўведзены новыя прадметы ваеннай формы, зменены мадэлі існуючых прадметаў адзення.**

- Амаль 20 міжгародніх аўтобусных маршрутаў цяпер адпраўляюцца з аўтавакзала «Усходні».
- **Брыгады сацработнікаў у Мінску будуць дастаўляць адзінокім пажылым людзям прадукты і лекі.**
- Грамадскі транспарт Мінска з 23 сакавіка раніцай будзе хадзіць часцей.
- **Бабруйскі завод біятэхналогій пачаў выпускаць антысептычны гель для рук.**
- Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў плануе сёлета запусціць рыбу ў 21 вадаём.

РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ПАДОЎЖАЦЬ ДА КАНЦА МАЯ

Фінальны этап рэпетыцыйнага тэсціравання не адмяняецца, але пройдзе з захаваннем усіх рэкамендацый эпідэміялагічнай службы ў сувязі з пагрозай распаўсюджвання вострых рэспіраторных інфекцый і каранавіруса. Пра гэта журналісту Звязды» паведамілі ў прэс-службе Міністэрства адукацыі.

Традыцыйна менавіта трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання прыцягвае найбольшую колькасць патэнцыйных абітурыентаў. У сувязі з гэтым становяцца актуальнымі рэкамендацыі па абмежаванні колькасці людзей у адной аўдыторыі.

Да пачатку рэпетыцыйнага тэсціравання ва ўсіх установах адукацыі павінен быць забяспечаны запас сродкаў дэзінфекцыі і вадкага мыла. Пры ўваходзе ў навучальныя карпусы, аўдыторыі, санвузлы і г. д. размесцяць антысептычныя сродкі для апрацоўкі рук. Акрамя таго, арганізуюць дадатковую апрацоўку дзвярных ручак, дзвярэй, поручняў, парэнчаў, кранаў і іншых месцаў, якія маюць вялікую колькасць тактыльных кантактаў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

«Для вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі задзейнічаць беларускія прадпрыемствы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Мы дамовіліся, што вернемся да Падатковага кодэкса, паглядзім, што блага, што добра. Я не магу адразу сказаць, што для нас яны дабро (СЭЗ. — **«Зв.»**). Для дзяржавы. З пункту гледжання людзей, зарплаты — малайчына, высокатэхналагічная вытворчасць... Экспарт-імпарт і іншае — усё гэта павінна прыносіць карысць дзяржаве праз падаткі і гэтак далей», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: калі структура Кодэкса адпавядае сучасным патрабаванням, чапаць яго не патрабуецца. Увагу трэба звярнуць менавіта на льготы, якія атрымліваюць прадпрыемствы. Калі дзяржава нешта праз гэта губляе, падыходы трэба мяняць, лічыць беларускі лідар. Ён нагадаў, што свабодныя эканамічныя зоны ствараліся з мэтамі — заняць людзей, прыцягнуць інвестараў і экспартаваць тавары.

ЛЮДЗІ — САМЫ ДАРАГІ РЭСУРС

Кіраўнік прадпрыемства Уладзімір Лінёў перакананы, што эканоміка не можа развівацца за кошт ільгот. З такім меркаваннем згадзіўся і кіраўнік дзяржавы. Таму просьбу АДАНІ аб вялікай пляцоўцы для новай будоўлі «завода заводаў» прынцыпова задаволіў.

«Я гатовы табе аддаць тэрыторыю, але для мяне будзе важна, каб ты для вытворчасці свайго высокатэхналагічнага прадукту задзейнічаў беларускія прадпрыемствы», — паставіў умову Прэзідэнт. У прыклад такой кааперацыі быў прыведзены «Зеніт» у Вілейцы.

Яшчэ адна агульная праблема дзяржавы і бізнесу — падрыхтоўка кадраў. Напрыклад, АДАНІ гатова плаціць стыпендыю студэнтам, вучыць будучых спецыялістаў з пяці ВНУ, даць умовы для напісання дысертацыі.

«Пажадаеш ты падрыхтаваць спецыяліста — заплаціў, рыхтуй», — звярнуўся Прэзідэнт да кіраўніка кампаніі.

«Калі не жадаеш потым працаваць, не трэба. Але ты вярні мне грошы, — адрасаваў наступны пасыл Аляксандр Лукашэнка меркаванаму выпускніку ВНУ. — Усё гэта мы ўрэгулюем. ***Самы дарагі рэсурс — гэта адукаваныя людзі».***

Кіраўнік дзяржавы намераны выправіць сітуацыю, каб дэфіцытныя спецыялісты адчувалі адказнасць перад тымі, хто іх выгадаваў.

УСТАЛЁЎВАЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ

Прэзідэнта азнаёмілі з навукаёмістымі распрацоўкамі, якія зарэкамендавалі сябе па ўсім свеце. Перасовачныя флюарографы, лічбавыя тамографы, мамографы, апараты для лячэння раку скуры — усё абсталяванне сусветнага ўзроўню, і, як звярнуў увагу Прэзідэнта міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, калісьці ніхто не верыў, што айчынны вытворца можа гэта зрабіць.

Па даручэнні Прэзідэнта цяпер завяршаецца будоўля новага корпуса Мінскага анкадыспансера — у конкурсе на камп'ютарны тамограф перамагла фірма АДАНІ, паведаміў міністр.

«Узяць на кантроль пытанне забеспячэння медыцынскіх установ аналагічнага класа апаратамі ўласнай вытворчасці. Гэта сваё, яно таннейшае... ***Але калі яны вынік даюць,*** калі гэта ***якасць***», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах міністра, цяпер ідуць перагаворы, каб кампанія АДАНІ ўзяла пад цэнтралізаванае сэрвіснае абслугоўванне ўсю сваю тэхніку, што сёння працуе ў медустановах (больш за 850 адзінак). Гэта дазволіць сэканоміць час і выключыць працяглы прастой абсталявання.

«Галоўнае, што ты свой, ты на месцы, і гэта танней. Той жа клас — і танней», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Штогод на абсталяванні АДАНІ ў Беларусі абследуюцца не менш за 4,5 мільёна людзей — гэта велізарны сацыяльны вынік, паведаміў Уладзімір Лінёў.

На прадпрыемстве «АДАНІ».

Фота БелТА.

УМЕЕШ САМ — НАВУЧЫ ІНШАГА

Каб лепш працаваць па медыцынскім кірунку, АДАНІ запрасіла кардыёлага Антоніса Джозефа, ураджэнца Шры-Ланкі, на пасаду дырэктара па развіцці. Антоніс прыехаў у Мінск дваццаць тры гады таму, ажаніўся, мае дваіх дзяцей. Цяпер працуе ў 20-й паліклініцы.

«Ён працуе дзесьці ў паліклініцы, а мог бы такіх аднавіць, кланіраваць, груба кажучы, дзясятак-два. Гэтых маладых людзей трэба абавязкова знаходзіць і падымаць наверх», — звярнуўся да міністра аховы здароўя Прэзідэнт.

Антоніс Джозеф з гонарам паведаміў Аляксандру Лукашэнку, што тэхніка АДАНІ выкарыстоўваецца і на яго родным востраве. У адказ на падзяку Прэзідэнта за працу ён пажадаў яму здароўя. «Ты, пэўна, не тыя рэсурсы чытаеш. Мяне праз дзень то хаваюць, то каранавірус, то яшчэ нешта», — пажартаваў Аляксандр Лукашэнка.

ЛАКАМАТЫЎ ІНАВАЦЫЙНАЙ ПРАДУКЦЫІ

Па ўсёй краіне ёсць прадпрыемствы, якія вырабляюць высокатэхналагічную прадукцыю, сказаў Прэзідэнт, адказваючы на пытанне журналістаў пра ўражанні ад наведвання кампаніі «АДАНІ».

«Вядома, мы адстаём ад планаў, якія былі на бягучую пяцігодку, але маем вопыт работы, — сказаў ён. — Гэта — узор, высокі інтэлект, высокі ўзровень імпартазамяшчэння. ***Гэта амбіцыі вялікія — убачылі недзе за мяжой, дзе нешта вырабляюць: а што, мы не можам?***»

Аляксандр Лукашэнка назваў кампанію «АДАНІ» лакаматывам інавацыйнай прадукцыі.

«Я хачу, і думаю, што гаспадары пагодзяцца, каб яны «на прычэп» узялі нашы іншыя прадпрыемствы і цягнулі за сабой. Няхай вырабляюць камплектуючыя для іх», — падзяліўся думкамі кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт паабяцаў кантраляваць, каб не ўзнікала перашкод для развіцця падобных прадпрыемстваў. Ён прызнаўся, што яму спадабалася вытворчасць, якую ўбачыў.

«Гэта будучыня. Не толькі таму, што добра робяць. Яны экспартам займаюцца, па ўсім свеце працуюць. Валюту ў краіну прывозяць — гэта вельмі важна, — адзначыў беларускі лідар. — ***Высокатэхналагічная вытворчасць падымае нас на вышэйшы ўзровень развіцця***. За гэта ўдвая трэба дзякаваць такім людзям».

ЦІ ЎДАСЦА ЎТРЫМАЦЬ РАЎНАВАГУ

На пытанне, ці чакаць беларусам эканамічнага крызісу, Аляксандр Лукашэнка адказаў наступным чынам: «Не хачу быць банальным, але скажу сваё меркаванне. ***Што датычыцца фінансава-эканамічнага крызісу, мы ўжо туды адной нагой ступілі. А зараз, паколькі валацільнасць высокая, хістанні вельмі высокія па ўсіх кірунках, мы спрабуем гэтую нагу вярнуць на месца.*** Вось у чым, з майго пункту гледжання, галоўнае пытанне — ці ўдасца нам назад гэтую нагу вярнуць і побач паставіць, або мы туды і другую нагу ўсунем».

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння яшчэ не зразумела, будзе гэта жорсткі крызіс ці нам удасца вярнуцца на папярэдні ўзровень развіцця.

«Магчыма, я ў нечым памыляюся. Трэба аналізаваць, што мы цяпер робім. Наперадзе Пасланне Прэзідэнта да парламента і народа, таму мы вядзём прапрацоўкі і аналіз некаторых кірункаў, і, магчыма, ужо да таго часу абстаноўка дазволіць нам зрабіць пэўную адназначную выснову», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

ВЯСНА ПАКУЛЬ ІДЭАЛЬНАЯ

Журналісты пацікавіліся, як анамальна цёплая зіма і ў цэлым змены клімату адаб'юцца на сельскай гаспадарцы і ці гатовая краіна да кліматычных катаклізмаў. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што аграрны сектар эканомікі гатовы да змен клімату, а сённяшняя сітуацыя проста ідэальная для пасяўной.

«Чаму ідэальная? Пры высокіх тэмпературах зімой ішлі дажджы, таму пры адсутнасці снегу вялікі запас вільгаці ў глебе», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў: у сувязі з такімі пакуль спрыяльнымі ўмовамі трэба хутчэй пасеяць раннія збожжавыя і ў цэлым арганізавана правесці веснавыя палявыя работы. Ён не выключыў, што тады атрымаецца скончыць у больш раннія тэрміны ўборку збожжавых. «Гэта значыць, пакуль усё ідэальна: і вільгаці хапае, і тэмпература нармальная», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў цэлым у краіне досыць даўно прымаюцца меры ў сувязі са зменай клімату. Гэта датычыцца новых відаў культур, якія раней вырошчваліся ў больш паўднёвых рэгіёнах, а цяпер — і ў нашай краіне.

«СІТУАЦЫЯ НЕ ТАКАЯ, КАБ ПРЫМАЦЬ «ДРАКОНАЎСКІЯ» МЕРЫ»

Адно з пытанняў журналістаў Прэзідэнту датычылася рэакцыі дзяржавы на безадказнае стаўленне некаторых беларусаў да эпідэміялагічнай рызыкі ў святле аб'яўленай пандэміі каранавіруса.

«Сутнасць вашага пытання ў тым, што трэба людзей урэшце прымусіць адказваць за сябе і за тых, хто побач, — удакладніў Прэзідэнт. — Калі кашляеш, дык не выходзь на вуліцу і заразу не разнось! У гэтым сутнасць уся. ***І многія дзяржавы вельмі жорсткія меры ў гэтым плане прымаюць. Чаму я гэтага не раблю? Скажу вам шчыра: мы не знаходзімся ў той сітуацыі, каб прымаць «драконаўскія» меры».***

Так, ёсць людзі, якія ставяцца безадказна, пагадзіўся беларускі лідар. Так адбылося з адным з інфіцыраваных беларусаў, які пасля вяртання з-за мяжы меў больш за тры сотні кантактаў першага ўзроўню, перш чым трапіў у стацыянар.

«Дзякаваць богу, што яны (людзі, з якімі кантактаваў хворы. — **«Зв.»**) аказаліся здаровыя. Не значыць, што яны не заражаныя былі, яны проста перанеслі на нагах гэты вірус. Вось чаму я кажу: «Псіхоз пачаўся». Кітайцы нас праінфармавалі: у іх 85 працэнтаў — лёгкія формы, якія перанеслі хваробу як звычайны грып. Мы пераносілі розныя вірусы, і зараз пераносіць грамадства ва ўсіх краінах. Таму хвалявацца асабліва не трэба, але нельга і супакойвацца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Калі чалавек падхапіў інфекцыю, ён павінен праінфармаваць урачоў і лячыцца, напомніў простую аксіёму беларускі лідар. ***Людзей трэба напружваць, каб яны больш адказна ставіліся да стану свайго здароўя,*** пагадзіўся Прэзідэнт. І не толькі зараз. Цяпер жа важна не паддацца сусветнай паніцы.

Людзям трэба быць больш спакойнымі, і пакуль у нас няма такога вар'яцтва, як у Заходняй Еўропе, адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Малю Бога, каб да Вялікадня мы вось так спакойна прайшлі гэты перыяд. А далей той каранавірус, як міністр сказаў, сам здохне, — усміхнуўся Аляксандр Лукашэнка. — Бо вясна пачынаецца, перыяд гэты заканчваецца. Мяне радуе тое, што пік захваральнасці на грып і розныя вірусы ўжо пройдзены. На гэтым фоне, вядома, і каранавірус будзе сыходзіць. Абавязкова. Бо каранавірус ускладнёны і ўмовамі, і кліматам, і сезоннасцю, якую мы заўсёды перажываем. Таму трэба спакойна працаваць».

Берагчы сябе трэба, а для жорсткіх мер, на думку беларускага лідара, сітуацыя павінна саспець. Прэзідэнт зноў растлумачыў, што ў Беларусі ёсць перавагі ў вызначэнні носьбітаў каранавіруса, бо самы пільны маніторынг пачынаецца ад моманту перасячэння граніцы тымі, хто можа аказацца заразны, адсочваюцца таксама ўсе кантакты такіх людзей. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу: пільнасць і медыкаў, і саміх беларусаў да рэспіраторных інфекцый ужо мае эфект — сёлета смяротнасць ад пнеўманіі ў нашай краіне значна меншая, чым летась і ў папярэднія гады.

ВЯРНУЎСЯ З-ЗА МЯЖЫ — ПАСЯДЗІ ДОМА!

Што датычыцца беларусаў, якія цяпер апынуліся за межамі радзімы (такіх каля 10 тысяч), то яны будуць усе вернутыя, хоць у адзін момант гэта зрабіць немагчыма. Пры гэтым беларускія ўлады не будуць падзяляць сваіх суайчыннікаў і расіян.

«Няхай мы не такія багатыя, як яны, мы не закрываемся, як яны, але мы іх павінны вывезці адтуль, — сказаў пра грамадзян суседняй дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. — Дарэчы, расіяне на борт нашых людзей у Тайландзе і іншых мясцінах не пускаюць. Але, думаю, дамовімся. Гэта звычайная бязглуздзіца. Гэта глупства. Гэта практычна для Расіі нічога не каштуе, а шкоды прынясе вялізнае мноства. Вось тады і будзе інтэграцыя ў двукоссях».

На нарадзе са спецыялістамі-эпідэміёлагамі было прынятае рашэнне раздаваць памяткі пра тое, што трэба рабіць, усім, хто вяртаецца з-за мяжы, паведаміў Аляксандр Лукашэнка. Размова пра рэкамендаваную ў гэтым выпадку самаізаляцыю: «Міліцыі і КДБ далі каманду, каб яны кантралявалі ўсё і дакладвалі аж Прэзідэнту. Мы без прыняцця нейкіх законаў, пры нашай сённяшняй сітуацыі з чалавека спытаем, калі ты вяртаешся з-за мяжы і не ідзеш на гэтую самаізаляцыю. Навошта ў бальніцы трымаць? Праўда, яны і самі не вельмі хочуць».

Кіраўнік дзяржавы таксама паўтарыў, што з вопыту кітайцаў каранцін не дае плёну.

«Учора ***мы прынялі рашэнне, што недзе лепш перастрахавацца, але не залішне,*** — падсумаваў Прэзідэнт. — Гэта вельмі вялікая, шматгранная работа, і я вельмі рады, што ***нашы вірусолагі і ўрачы ведаюць, што рабіць. Мы робім усё, каб абараніцца».***

Варвара МАРОЗАВА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На слыху

Паправіліся 15 пацыентаў, 54 застаюцца ў бальніцах

Што мяняецца ў рабоце паліклінік у сувязі з COVID-19

Пятнаццаць чалавек у Беларусі, у якіх быў выяўлены каранавірус, здаровыя і выпісаны з інфекцыйных стацыянараў, 54 са станоўчымі аналізамі на COVID-19 застаюцца ў бальніцах.

— У цяперашні час пад медыцынскім назіраннем знаходзяцца 42 пацыенты са станоўчымі лабараторнымі тэстамі, але без клінічных праяў хваробы. Клінічныя прыкметы інфекцыі COVID-19 маюць, гэта значыць з'яўляюцца, па сутнасці, хворымі, 12 пацыентаў, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Усяго, пачынаючы з канца студзеня, больш за 19 тысяч чалавек абследаваны на інфекцыю COVID-19. За тры тыдні ў краіне зафіксавана 69 выпадкаў новага каранавіруса (нагадаем, што першы выпадак быў выяўлены 27 лютага).

На гэтым тыдні апублікаваны загад Міністэрства аховы здароўя № 296 «Аб мерах па аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з прыкметамі рэспіраторнай інфекцыі і прыняцці дадатковых супрацьэпідэмічных мер у арганізацыях аховы здароўя». Ён рэгламентуе парадак аказання дапамогі пацыентам з COVID-19 і тым, хто з імі кантактаваў. Часова змяняецца і работа паліклінік. У Міністэрстве аховы здароўя расказалі, што мяняецца для іх наведвальнікаў.

Калі вы захварэлі

Калі вы захварэлі і ў вас павысілася тэмпература, з'явіўся кашаль, задышка, закладзены нос, заставайцеся дома і патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр установы аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы знаходжання). У размове з супрацоўнікам паведаміце, што вас непакоіць, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас, тэлефон). З вамі звяжацца медыцынскі работнік — прытрымлівайцеся яго ўказанняў.

Варта ўлічваць, што ў амбулаторна-паліклінічных установах арганізаваны асобныя ўваходы і кабінеты для прыёму пацыентаў з тэмпературай і сімптомамі вострай рэспіраторнай інфекцыі.

Калі вы хочаце прайсці флюараграфію ці іншыя абследаванні

Дыспансерызацыю, рэабілітацыю, лабараторныя і інструментальныя абследаванні ў планавым парадку, у тым ліку флюараграфію органаў грудной клеткі, ЭКГ, холтэраўскае манітараванне, увядзенне ін'екцыйных лекавых сродкаў праз працэдурны кабінет часова адкладзіце.

Калі патрэбны рэцэпт

Калі вы маеце патрэбу ў выпісцы рэцэптаў на лекавыя сродкі для пастаяннага прыёму, якія былі раней прызначаны ўрачом, патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр установы аховы здароўя па месцы жыхарства, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас, тэлефон). З вамі звяжацца медыцынскі работнік, які арганізуе выпіску і дастаўку рэцэптаў на дом.

Калі вам больш за 60 гадоў

Калі вы старэйшыя за 60 гадоў і маеце патрэбу ў аглядзе медыцынскага работніка ў сувязі з пагаршэннем самаадчування, патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр медыцынскай установы па месцы жыхарства, паведаміце пра гэта, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас і тэлефон). Цягам дня з вамі звяжацца медыцынскі работнік для ўзгаднення часу для візіту на дом.

Пазбягаючы планавага наведвання медыцынскай установы, вы дазволіце медыкам працаваць больш эфектыўна і дапаможаце абараніць вас і іншых ад магчымага заражэння і распаўсюджвання інфекцыі COVID-19.

Калі патрэбна выпіска з медыцынскіх дакументаў

Афармленне выпісак з медыцынскіх дакументаў арганізавана па анлайн-заяўках на інтэрнэт-сайтах установ з наступнай іх выдачай пацыентам пры прад'яўленні пасведчання асобы, у спецыяльна адведзеным месцы.

Алена КРАВЕЦ.

ТУРЫСТЫ ВЯРТАЮЦЦА

У сталіцы ўчора прызямліўся борт з беларускімі грамадзянамі з аэрапорта Унукава

Чартарным рэйсам авіякампаніі «Белавія» дадому вярнуліся 114 пасажыраў. Рэйс адбываўся па заказе турыстычнай кампаніі «Анекс тур».

Фота БелТА.

«У краіны, дзе ёсць паветраныя авіязносіны, авіякампанія працягвае лётаць і арганізоўваць рэйсы, каб беларусы маглі вярнуцца ў Мінск. На гэты час «Белавія» арганізавала тры дадатковыя чартарныя рэйсы па маршруце Мінск — Баку, каб грамадзяне Азербайджана маглі вярнуцца ў Баку і, адпаведна, грамадзяне Беларусі маглі прыляцець у Мінск. Таксама сумесна з турыстычнымі аператарамі мы робім усё магчымае для таго, каб па ўзгодненым графіку вярнуць турыстаў з Егіпта дадому», — перадае словы **начальніка аддзела рэкламы і камунікацый «Белавія» Вольгі ГЕРАСЕНКА БелТА.**

Расія пасля закрыцця граніц для беларусаў пакінула магчымасць транзіту праз маскоўскія аэрапорты Шарамеццева і Дамадзедава з умовай, што грамадзяне вылецяць у Беларусь на працягу 24 гадзін. Аднак большасць расійскіх рэйсаў з краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна прыбываюць у маскоўскі аэрапорт Унукава, адкуль няма прамых рэйсаў у Мінск.

«Мы адпачывалі ў Тайландзе 12 дзён, усё было выдатна. За два дні да вылету нам сказалі, што нас не пасадзяць на борт самалёта да Масквы. У выніку з вялікімі праблемамі нас даставілі ў Маскву. Ва Унукава мы прыляцелі сёння раніцай, — расказалі БелТА Аксана і Сяргей з Бабруйска. — У нас была праблема паляцець з Тайланда, але калі мы прыляцелі ў Маскву, былі ўпэўнены: наша краіна нас не кіне, і нас даставяць дадому».

Сітуацыю з беларускімі грамадзянамі, якія не могуць вярнуцца ў краіну з-за закрыцця граніц, пастаянна кантралюе Міністэрства замежных спраў Беларусі. Як перадае прэс-служба МЗС, учора кіраўнік ведамства Уладзімір Макей па тэлефоне правёў перагаворы з латвійскім і літоўскім калегамі. Падчас размовы была ўдзелена ўвага ўзаемадзеянню па перамяшчэнні грамадзян праз агульныя граніцы.

Міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс падзякаваў беларускаму боку за магчымасць транзіту латвійскіх грамадзян з трэціх краін праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Уладзімір Макей выказаў удзячнасць літоўскаму ўраду ў асобе міністра замежных спраў Лінаса Лінкявічуса за аператыўнае вырашэнне праблемных пытанняў, пазначаных беларускім бокам на працягу апошніх дзён. Міністры дамовіліся аб падтрыманні пастаяннага кантакту для ўрэгулявання праблем, якія ўзнікаюць у сувязі з крызіснай сітуацыяй.

«Па звестках Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь, толькі за апошнія трое сутак за мяжу выехала каля 11 тысяч грамадзян нашай краіны. Падкрэсліваем, што гэтыя выезды ажыццяўляюцца пасля дакладных рэкамендацый МЗС устрымацца ад замежных паездак», — заявіў **прэс-сакратар МЗС Анатоль ГЛАЗ.**

Дыпламаты яшчэ раз настойліва раяць адмяніць паездкі без пільнай неабходнасці за мяжу ў гэты перыяд. Ведамства падкрэслівае, што грамадзяне, якія ажыццяўляюць падобныя крокі, павінны разумець, што робяць гэта на свой страх і рызыку.

Марыя ДАДАЛКА.

РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ПАДОЎЖАЦЬ ДА КАНЦА МАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пад правядзенне РТ не будуць задзейнічаць паточныя аўдыторыі з вялікай колькасцю пасадачных месцаў. У аўдыторыях будзе выкарыстоўвацца прынцып мінімізацыі рызык распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый: абітурыентаў пасадзяць не менш чым за метр адно ад аднаго, памяшканне будзе праветрывацца.

Меркавалася, што рэпетыцыйнае тэсціраванне скончыцца ў канцы красавіка, але Міністэрства адукацыі рэкамендавала падоўжыць гэты этап да 24 мая.

Яшчэ раней ВНУ было рэкамендавана адмовіцца ад лекцый, каб пазбегнуць масавага збору людзей, і выкарыстоўваць іншыя формы заняткаў.

Прарэктар па выхаваўчай рабоце БДУІР Дзмітрый КУЗНЯЦОЎ паведаміў, што для большасці студэнтаў іх універсітэта пачатак вучэбных заняткаў быў перанесены на 9.45. Асобныя вучэбныя заняткі пераведзены на кіраваную работу студэнтаў у плане засваення тэарэтычнага матэрыялу. Для дадатковага кансультавання студэнтаў арганізавана ўзаемадзеянне з выкладчыкамі ўніверсітэта з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

У БНТУ таксама плануюць скарэкціраваць расклад вучэбных заняткаў з пачатку наступнага тыдня: прапрацоўваюцца розныя варыянты арганізацыі навучальнага працэсу з улікам ранішняга часу пік, калі большая частка мінчан дабіраецца на работу на грамадскім транспарце.

Акадэмія кіравання перавяла ў дыстанцыйны рэжым вялікія паточныя лекцыі і іншыя падобныя заняткі, каб пазбегнуць вялікіх мас людзей. «Мы прыкладаем усе намаганні, каб гэта ніяк не адбілася на якасці навучання. Да выкладчыкаў прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні з нагоды кантролю. Студэнты даюць справаздачу па адпрацоўцы кожнага элемента курса, — паведаміў **першы прарэктар Валерый БАРАДЗЕНЯ** карэспандэнту БелТА. — У акадэміі разлічваюць, што гэта ў нейкай меры матывуе маладых людзей займацца больш старанна. Кожны дыстанцыйны курс суправаджаецца формамі кантролю. Студэнтам трэба не толькі прачытаць лекцыю, але і адказаць на кантрольныя пытанні, здаць невялікі тэст».

Ва ўсіх ВНУ абмежавалі навуковыя і культурна-масавыя мерапрыемствы або праводзяць іх у анлайн-рэжыме.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Саюз моладзі арганізаваў работу гарачых ліній

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі з сённяшняга дня арганізуе ва ўсіх рэгіёнах работу гарачых тэлефонных ліній для аказання інфармацыйнай дапамогі пажылым людзям, паведаміў другі сакратар Цэнтральнага камітэта Саюза моладзі Алег ДЗІКУН.

Паводле яго слоў, гарачыя тэлефонныя лініі ствараюцца пры кожным тэрытарыяльным камітэце БРСМ з мэтай аказання інфармацыйнай дапамогі адзінокім людзям ва ўзросце ад 65+. «На першым этапе работы гарачых ліній нашы валанцёры змогуць падказаць бабулям і дзядулям тэлефоны тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, гігіены і эпідэміялогіі, найбліжэйшых устаноў аховы здароўя. Калі лінія выкліканага абанента будзе доўга занятая, нашы валанцёры дапамогуць аператыўна атрымаць зваротную сувязь, — расказаў Алег Дзікун. — Гарачыя лініі пачалі работу з учарашняга дня».

Акрамя таго, па жаданні пажылых людзей актывісты Саюза моладзі дапамогуць ім праз інтэрнэт замовіць тавары першай неабходнасці. **Маладзёжныя гарачыя лініі будуць працаваць штодзённа з панядзелка да суботы ўключна з 9.00 да 18.00. Тэлефоны абласных гарачых ліній: у Брэсце — 8 (0162) 21 15 91, Віцебску — 8 (0212) 66 20 87, Гомелі — 8 (0232) 56 33 15, Гродне — 8 (0152) 71 98 33, Магілёве — 8 (0222) 76 67 82. Тэлефоны гарачых ліній у буйных гарадах Мінскай вобласці: у Салігорску — 8 (0174) 20 03 45, Слуцку — 8 (01795) 7 50 80, Маладзечне — 8 (0177) 74 95 01. У Мінску тэлефон гарачай лініі 8 (017) 284 85 54.**

Алег Дзікун таксама дадаў, што днямі Саюз моладзі запусціў у сацыяльных сетках чэлендж *#спасибомедикам* у знак падзякі людзям, якія кожны дзень заступаюць на медыцынскі пост і дзякуючы якім эпідэміялагічная сітуацыя ў Беларусі знаходзіцца пад кантролем. «Бо менавіта медыцынскія работнікі кожны дзень прымаюць выклікі на дом, вядуць прыёмы, наведваюць і лечаць хворых, даюць тлумачэнні і кансультуюць па прафілактыцы каранавіруснай інфекцыі, прызначаюць лячэнне і проста знаходзяцца побач. І пакуль некаторыя нагнятаюць паніку, гэтыя людзі робяць сёння ўсё магчымае, каб жыхары Беларусі былі здаровыя», — падкрэсліў ён.

Сяргей РАСОЛЬКА.

...КУПІЦЬ МАСКУ Ў АПТЭЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У камерцыйнай аптэцы на галоўнай плошчы горада — Перамогі — сказалі, што масак няма. Калі прывязуць, будуць прадаваць па 2 рублі 10 капеек.

Дарогу перайшоў, трохі прайшоў — ты ўжо каля ўваходных дзвярэй «Белфармацыі». У дзвюх аптэках на Маскоўскім праспекце прапаноўвалі маскі па 1 рублі 62 капейкі. А ў трэцяй, якая знаходзіцца недалёка ад галоўнага паштамта, ужо паспелі прадаць за 1 рубель 16 капеек. Фармацэўт сказала, што доўга чакаць не давядзецца і тавар будзе каштаваць столькі ж, бо маскі мясцовай вытворчасці.

Дарэчы, паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі маскі робяць сем вытворцаў. Штодня — звыш 100 тысяч штук, а на гандлёвых складах іх у наяўнасці больш за 1,5 мільёна. На сайце ведамства напісана: прадаюцца маскі паштучна (ад 17 капеек), упакоўкамі — па 3-5 штук (ад 58 капеек). Але ж у аптэках цэны не такія, як на афіцыйным сайце міністэрства. Канешне, інтарэс прадаўцоў ніхто не адмяняў, але...

У дзвюх камерцыйных аптэках розных сетак (ад адной да другой рукой падаць) цана масак была 1,56 і 1,42 рубля. Гэта танней, чым у «Белфармацыі».

На праспекце Чарняхоўскага ў дзяржаўнай аптэцы, якая працуе кругласутачна, каля дзвюх гадзін дня кошт масак быў 1,62 рубля. Што цікава, калі пазней тэлефанаваў туды ж, адказалі, што ёсць ужо і па 96 капеек — з завязкамі, а на гумках — па 1,41 рубля... Мо падвезлі? Ну дык і добра!

У адной з самых папулярных вялікіх крам Віцебска — «Грыне» — у камерцыйнай аптэцы на другім паверсе маска каштавала 2,25 рубля. Работнік сказаў, што яна дарагая, бо ўнутры вата.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

На вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў у краме «Капеечка» маскі прадавалі па цане 1,25 рубля. Дарэчы, гэта адзінае на маім шляху месца, дзе папулярны на сёння тавар выставілі так, каб было відаць, і з цаной: наклеілі на шкло, недалёка ад касавага апарата.

Цікава: а як з маскамі ў глыбінцы?

У райцэнтры Лёзна і ў сельскіх населеных пунктах раёна няма праблем з «маскавым пытаннем». Маскі ў аптэках «Фармацыі» каштуюць 1,16 рубля. У Лёзне яшчэ ёсць аптэка недзяржаўнага канкурэнта, дзе пад вечар у чацвер маскі скончыліся, але мне паабяцалі, што доўга чакаць не давядзецца. Цана — 1,45 рубля.

Юрый ДЗЕРКАЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама, падкрэслівае, што маскі ў дастатковай колькасці ёсць ва ўсіх аптэках. Ніякіх праблем. Калі ў нейкай прыватнай няма, аўтару гэтых радкоў прапанавалі адразу інфармаваць «інстанцыі», каб тавар аператыўна прывезлі.

На сёння няма толькі танных аднаслойных масак, бо яны кітайскай вытворчасці, у нас у краіне іх не вырабляюць, растлумачыў Юрый Дзеркач. Яны выкарыстоўваюцца для выдачы ў пунктах пропуску, для даследаванняў, бо іх зручна хутка здымаць і выкідваць. У найбліжэйшы час, адзначыў суразмоўца, выраб такіх масак будзе распачаты і ў нас.

УДАКЛАДНІЦЬ ПРАЗ ЗВАНОК

Што датычыцца сталіцы, то на сайце 103.by яшчэ раніцай значылася, што маскі можна набыць у 409 сталічных аптэках. Аднак, як параіў фармацэўт адной з камерцыйных аптэк, лепш карыстацца сайтам tabletka.by — там можна знайсці больш дакладную інфармацыю. А яшчэ лепш перастраховацца, каб не губляць час, і ўдакладніць усё, што вас цікавіць, праз званок у пэўную аптэку.

Напрыклад, сярод 409 аптэк, якія значацца на сайце 103.by, шмат дзяржаўных. Пасля званкоў у некаторыя з іх высветлілася, што інфармацыя сапраўды не заўсёды супадае. Так, шматразовыя марлевыя маскі, якія каштуюць больш за рубель, былі ў патрэбнай колькасці ва ўсіх аптэках. У адной з іх фармацэўт адразу адзначыла, што «на рукі» яны прадаюць сама болей 10—20 штук. А вось аднаразовых масак, якія каштуюць 28 капеек і значацца на сайце, у наяўнасці не было. Ва ўсякім разе, у тых аптэках, што мы абзванілі.

Былі на сайце і прыватныя аптэкі, дзе на самай справе масак не аказалася. У адной з камерцыйных кругласутачных аптэк фармацэўт параіла звярнуцца ў дзяржаўную сетку.

— Калі ў нас з'явяцца маскі, я не ведаю, але вы заўсёды можаце іх знайсці ў дзяржаўных аптэках, туды прывоз ажыццяўляецца кожны дзень, — растлумачыла спецыяліст. — Аднаразовых там можа не быць, але заўсёды ёсць марлевыя, іх можна выкарыстоўваць некалькі разоў — пасля прымянення памыць і адпрасаваць.

Таксама маскі былі ў выпадковых камерцыйных аптэках, якіх на сайце не аказалася. На гарачай лініі адной з іх адзначылі, што аднаразовыя маскі сталі зноў паступаць, але цяпер іх цана вырасла і набліжаецца да цаны шматразовых. Дарэчы, часцей за ўсё ў камерцыйных аптэках маскі і так каштуюць больш, чым у дзяржаўных.

А вось на сайце tabletka.by значыцца 507 аптэк, дзе можна набыць медыцынскія маскі. У асартыменце прадстаўлены аднаразовыя трохслойныя (ад 24 капеек), шматразовыя чатырохслойныя (ад 1,02 рубля) і нават рэспіратары (ад 3,31 рубля). У пошуку тавары падзяляюцца не толькі на віды, але і ў залежнасці ад вытворцы. Зусім невялікую колькасць складаюць маскі расійскай вытворчасці — на сайце яны значацца толькі ў адной аптэцы. Рэспіратары ж (толькі з Расіі) — у трох.

Аднак, пазваніўшы, мы высветлілі, што рэспіратараў нідзе няма. Дзесьці паведамілі, што прывоз ажыццяўляецца кожны дзень і што прывязуць сёння, яшчэ дакладна невядома, калі, а дзесьці сказалі, што іх ужо не будзе, але праз некалькі гадзін павінны прывезці маскі. У адзінай аптэцы, дзе значацца маскі расійскай вытворчасці, не аказалася ўвогуле ніякіх. Фармацэўт адзначыла, што гэты від тавару заўсёды стаіць у заяўцы і яна спадзяецца, што маскі з'явяцца ў продажы назаўтра.

Ва ўсіх жа 503 астатніх аптэках на сайце значацца тавары 10 розных беларускіх кампаній. У дзяржаўнай сетцы шматразовыя маскі былі ва ўсіх аптэках, што мы абзванілі.

— Зранку былі аднаразовыя, але іх разабралі, шматразовыя ёсць, — паведамілі ў дзяржаўнай аптэцы. — Калі яны зноў з'явяцца, мы не можам сказаць: прывоз плануецца на наступным тыдні, але гарантыі, што прывязуць менавіта аднаразовыя маскі, няма.

Так, у некаторых камерцыйных аптэках, якія значацца на сайце tabletka.by, не было ніякіх масак. Сям-там фармацэўты спадзяваліся на прывоз у найбліжэйшы час. Пасля абеду сайт даў новыя звесткі, прапаноў стала больш. Але і попыт пакуль не меншае.

Валерыя КІСЛАЯ, Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Извещение об аукционе 24 апреля 2020 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

Наименование объекта	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44951 «Здание очистных сооружений»	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-49718 «Участок железнодорожных путей № 1; № 6»
Номер лота	**1**	**2**
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Ю	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Э
Тип помещения	отдельно стоящее	отдельно стоящее
Общая площадь	205,0 кв. м	699,7 м
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	0,1879	0,3449
Начальная цена продажи	35 357,51	10 072,56
Шаг аукциона	5 % от начальной цены	5 % от начальной цены
Сумма задатка	3 535,75	1 007,26
Условия продажи	единовременный платеж	единовременный платеж
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка	здание одноэтажное, кирпичное, с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть). Резервуары для воды – 2 шт. Ввод в эксплуатацию – 1994 г.	участок железнодорожного пути № 1: - год постройки – 1971 г.; - ширина колеи – 1520 мм; - длина – 496,70 м. Участок железнодорожного пути № 6: - год постройки – 1971 г.; - ширина колеи – 1520 мм; - длина – 203,00 м

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями»	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий
Номер лота	**3**	**4**
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11	г. Пинск, ул. Калиновского, 11У
Тип помещения	совмещенное с другим изолированным помещением	отдельно стоящее
Общая площадь (кв.м)	3482,1	1930,1
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	0,2209	0,3941
Начальная цена продажи	66 546,46	341 298,70
Шаг аукциона	5 % от начальной цены	5 % от начальной цены
Сумма задатка	6 654,65	34 129,87
Условия продажи	возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка	здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г.	одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 м², помещение ремонтно-механического участка 294 м², помещение цеха доборных изделий 1456 м², пристройка 12 м², навес 24 м², градирня 33 м², два теневых навеса 7 м². Покрытие бетонное 1030 м². Ввод в эксплуатацию – 1970 г.

Организатор аукциона	**Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»**
Продавец аукциона	**Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»**

Аукцион состоится 24 апреля 2020 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале ОАО «ПКСИ».

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. ***Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 23 апреля 2020 г. включительно.***

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 23 апреля 2020 года включительно, тел. 8 0165-37-16-19, тел./факс 8 (0165) 37-16-66.

Контактный телефон 375-29-640-80-37.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	**ОАО «КУПАЛИНКА»,** Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Магазин «Кулинария» (здание специализированное розничной торговли) общ. пл. 354 кв. м, инв. № 644/С-766, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, д. 34А.

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина «Кулинария», общ. пл. 0,1363 га

Начальная цена (с НДС 20 %) – 1 192 800,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, , получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи	**10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов

Начало торгов: **11.00 22.04.2020**. Окончание торгов: **12.00 22.04.2020**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 20.04.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Открытое акционерное общество

Дорожно-строительный трест № 3

сообщает, что очередное общее собрание акционеров общества, намеченное на 25 марта 2020 года будет проведено в смешанной форме.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводится 25 марта 2020 года с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

УНП 700049607

Шануй сваё

ПРАВОБРАЗ ЕЎРАПЕЙСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Пад такой назвай у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстаўка рарытэтаў з Беларусі і Латвіі. Упершыню шырокай публіцы прадставілі спіс Статута ВКЛ 1588 года ў перакладзе на нямецкую мову пачатку XVIII стагоддзя са збору адной з найстарэйшых бібліятэк Еўропы — Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта. Рарытэт з'яўляецца наглядным прыкладам афіцыйнага выкарыстання беларуска-літоўскай протаканстытуцыі на землях Латвіі і сведчыць пра старажытныя культурныя, эканамічныя і палітычныя сувязі нашых народаў.

— Мы нядаўна святкавалі Дзень Канстытуцыі — асноўнага закона нашай краіны. Але ні суверэнная Беларусь, ні наш асноўны закон не з'явіліся сёння. Гэта падзеі з векавой гісторыяй. І выстаўка якраз паказвае доўгі шлях да таго, што мы маем сёння. Засталося менш чым дзесяць гадоў да таго моманту, калі ва ўсіх нас будзе нагода адсвяткаваць 500-годдзе Першага Статута Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (1529 год), фактычна першага збору права на тэрыторыі Еўропы. Ён вельмі доўга жыў і працаваў, вытрымаўшы некалькі рэдакцый, а беларуская прававая культура была прызнана не толькі на нашых землях, але і далёка за межамі тэрыторыі сучаснай Беларусі. І па гістарычных мерках зусім нядаўна, яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя, гэта быў прававы дакумент, якім карысталіся ў паўсядзённым жыцці, — расказаў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ.**

Два гады супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі вялі перамовы з кіраўніцтвам Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта, каб гэтая прававая крыніца стала даступная для шырокага кола даследчыкаў і зацікаўленых. Па папярэдніх даследаваннях кнігі бачна, што яна была ва ўжытку, яе актыўна чыталі: ёсць падкрэсленні, малюнкі, каментарыі на палях... Пасля завяршэння выстаўкі ў Нацыянальнай бібліятэцы плануюць правесці экспертны аналіз і зрабіць пэўную кансервацыю гэтага помніка, каб ён пражыў яшчэ не менш чым

Фота з сайта nlb.by

некалькі стагоддзяў. Гэта будзе ў тым ліку і ўнёсак беларускага боку ў захаванне нашай спадчыны за мяжой. Вядуцца перамовы пра магчымасць стварэння лічбавай копіі кнігі. А пасля выданне вернецца ў Латвію.

Дарэчы, даведаліся пра кнігу амаль выпадкова, калі **навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Алег ДЗЯРНОВІЧ** чатыры гады таму ўбачыў гэтае выданне ў каталогу Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта:

— Калі ў Рызе я ўпершыню ўзяў у рукі гэты фаліянт, то маё сэрца затрымцела. Мы, безумоўна, ведаем, што з ініцыятывы канцлера Льва Сапегі яшчэ пры яго жыцці былі падрыхтаваныя два выданні пераказу Статута з кірылічнага тэксту на польскую мову. Добра ведаем пра лацінскі пераклад Статута. Нешта мы сустракалі ў літаратуры XIX стагоддзя, прынамсі ў Ігната Даніловіча, які ў сваёй працы згадваў пераклад Статута ВКЛ на нямецкую мову. Я ўжо не першы год працую па акадэмічным абмене ў Рызе, таму рана ці позна павінен быў натрапіць на гэты асобнік. Што цікава, на тытульным лісце пазначана дата — 1632 год. Яшчэ ёсць інтрыга, дзе і якім чынам ён функцыянаваў. Сёння паміж гісторыкамі ёсць права дыскусіі пра гэты помнік. Мы вельмі коратка называем яго канстытуцыяй. Ёсць меркаванне, што гэта ўсё ж кодэкс, бо ў ім прапісаны артыкул пра пакаранні, чаго ў звычайнай канстытуцыі не пазначаецца. У любым выпадку гэта шматгранны юрыдычны помнік, які аб'ядноўвае галіны дзяржаўнага, сямейнага, зямельнага права. Там нават прапісаны першыя правілы дарожнага руху — хто каго павінен прапускаць. І такіх комплексных помнікаў у той час у Еўропе не было.

— Як на погляд аўтара «Авантур», наколькі дакладна Георгій Пятрэнка і Іван Трус увасобілі вобразы, якія вы выпісалі ў кнігах?

— Адзін да аднаго ўсё роўна не можа быць, тут быў важны дуэт, каб Пранціш і Лёднік былі розныя і адначасова дапаўнялі адзін аднаго, і, мне здаецца, гэтая дзіўная парачка атрымалася. Лёднік дужы, крыху змрочны, патрапаны жыццём, такі Полацкі Фаўст, які стрымлівае сябе, калі ўнутры ўсё кіпіць, а Пранціш — шчыры хлопец, які сцягне булку ў гандляркі, а праз набіты грашыма кашэль пераступіць. Дарэчы, у шляхты быў такі звычай даказваць, што ты не даражыш сваім багаццем, — людзі рэальна спаборнічалі ў тым, каб прамантачыць больш дабра, дык вось бацька Пранціша перамог.

— Не магу не спытаць: як вы ставіцеся да таго, што карціна першапачаткова рускамоўная?

— Я ўвесь час спадзявалася, што фільм будзе зроблены на беларускай. Уся здымачная група была «за», беларуская мова тут проста напрошваецца, нават у рускамоўным варыянце шмат беларускіх слоўцаў і выразаў — усіх гэтых вашамосцяў і лабідудаў. Пытанне было ў фінансах. Дырэктар кінастудыі Уладзімір Карачэўскі казаў, што будзе шукаць сродкі на пераагучку, і я вельмі рада, што прэм'ера ўрэшце адбудзецца менавіта на беларускай. Мне здаецца, фільм нават успрымацца будзе па-іншаму.

— Ці дапамагалі вы ствараць на экране XVIII стагоддзе, у прыватнасці праз лексіку?

— Канешне, хто ж яшчэ ім скажа, што на полі бою ў нас крычалі «Рубон!» і «Гэй, ліцвіны, Бог нам радзіць!» Калі я трапляла на здымачную пляцоўку, маёй задачай таксама было папярэджваць ляпсусы, да мяне ўвесь час падбягалі і пыталіся, напрыклад, ці клаліся на княжацкія сталы падчас застолляў сурвэткі і як яны раскладваліся. Калі ўзнікалі пытанні, на якія я не ведала адказу, тэлефанавала знаёмым гісторыкам. Адзін да аднаго эпоху перадаць немагчыма — так, можна паўтарыць касцюмы і рэквізіт, але з ментальнасцю цяжэй. Засведчана, што Міхал Казімір Радзівіл «Рыбанька» на адным з застолляў у Нясвіжы ўбачыў, што пэўнай даме паставілі брудную срэбную талерку, — ён падышоў, выцер яе крысом свайго адзення і паставіў назад. Аказаў даме такую паслугу — уявіце, як такое зняць? Дарэчы, той жа «Рыбанька» забараняў мыць срэбны посуд, каб срэбра не сціралася.

— Вы напісалі серыю кніг аб прыгодах Пранціша Вырвіча — чаму вам было цікавае менавіта XVIII стагоддзе?

— Гэта класны час, прычым мала вербалізаваны, я даўно хацела там пажыць. XVIII стагоддзе вельмі прыдатнае да таго, каб даць волю сваёй фантазіі, бо гэта эпоха асветніцтва, вынаходніцтваў, баляў, інтрыг і вольнасці нораваў, якая спалучалася з кансерватыўнымі сармацкімі традыцыямі. У той час ладзіліся рэдуты, то-бок балі, дык вось на гарадзенскіх рэдутах у княгіні Агінскай па новай модзе танчылі ў празрыстых сукенках, праз якія ўсё было бачна, з аголенымі грудзямі, у сандалях з нанізанымі на пальцы ног пярсцёнкамі. А паралельна шляхцянкі адзяваліся па строгіх правілах, абавязкова насілі гарсэт, спалі ў вузкіх пальчатках, каб пальцы былі тонкія, і насілі вузкія туфлі. А прыходзячы дадому, шляхцічы бухаліся на калені і цалавалі рукі і ногі сваім бацькам — прывітанне такое, згодна з сармацкім кодэксам. Гэта вельмі разнастайная і багатая эпоха, і я выкарыстоўвала ўсё, што знаходзіла. У каханай Лёдніка Саламеі, напрыклад, адгукаецца Саламея Рэгіна Русецкая — беларуская лекарка, якая ездзіла па ўсёй Еўропе і лячыла князёў-каралёў.

«І князі, і рыцары, і дамы, і шляхта, і простыя людзі — усё тут было, і не хадзілі беларусы ў лапцях. У фільме персанажаў у лапцях няма — нават простыя беларусы ў той час насілі скураны абутак, які называўся поршнямі».

— А Лёднік — гэта Скарына?

— Галоўныя героі — сінтэтычныя вобразы, але Францыск Скарына ў Лёдніку, канешне, адгукаецца, бо Баўтрамей — палачанін, сын рамесніка, скончыў два еўрапейскія ўніверсітэты. І, дарэчы, першадрукар таксама захапляўся алхіміяй, што было вельмі распаўсюджана сярод адукаваных людзей. Да таго ж Скарына, ёсць такая гіпотэза, як і Лёднік, спрабаваў здабыць філасофскі камень — тады гэта было накшталт духоўнай практыкі.

— Колькі вам трэба было сабраць гістарычнага матэрыялу, каб напісаць «Вырвіча»?

— Калі я напісала першую кнігу серыі, вырашыла скласці спіс крыніц, дзе брала інфармацыю для рамана, — у выніку кінула на двухсотай. Пісьменнік — як сарока: звівае гняздо і цягне ў яго ўсё бліскучае. Гэты працэс адбываецца пастаянна, хоць патрошку, але пішу я кожны дзень і кожны дзень нешта чытаю, удакладняю. Мае кнігі — не навуковыя манаграфіі, нават жанр «Авантур», каб у мяне ніхто не кінуў пантофлем, гучыць як прыгодніцка-фантасмагарычны раман. Тым не менш праўдападобнасць я захоўваю — думаю, менавіта таму некаторыя шукаюць у энцыклапедыях звесткі аб Францішу Вырвічу і Баўтрамею Лёдніку, упэўненыя, што яны — рэальныя персанажы.

— Ці можам мы шукаць у XVIII стагоддзі беларускую ідэнтычнасць?

— Мы павінны гэта рабіць і ўвогуле працаваць над стварэннем беларускага нацыянальнага міфа, у які, на маю думку, абавязкова павінны ўваходзіць Беларусь рыцарская, Беларусь шляхецкая эпохі ВКЛ, Беларусь інсургенцкая — гэта часы польска-беларуска-літоўскіх паўстанняў з цэлым пантэонам герояў-патрыётаў, і Беларусь рэпрэсаваная 1920-30-х гадоў, часоў «Узвышша» і «Маладняка». У нашай гісторыі шмат пасіянарыяў, пра якіх можна пісаць раманы і здымаць серыялы, даволі герояў з беларускімі адметнасцямі і мухамі ў галаве, і я паслядоўна ўвасабляю гэтыя свае ідэі. Серыя пра Вырвіча таксама працуе на беларускі нацыянальны міф, я ўпэўнена, і фільм, нягледзячы на некаторыя недахопы, будзе на яго працаваць. Ужо на перадпаказе людзі выходзілі з глядзельнай залы са здзіўленнем, што Беларусь была такая і ў Беларусі было такое.

— А якія гэта беларускія адметнасці і мухі ў галаве?

— Мы — у цэнтры Еўропы, на яе скрыжаваннях, на сутыччы культур, пра што яшчэ Ігнат Абдзіраловіч пісаў. У маім рамане чоценька прасочваецца, што Беларусь мультыканфесійная і мультынацыянальная: у ім дзейнічаюць людзі розных канфесій — я паказваю складаныя ўзаемаадносіны паміж імі — і людзі розных нацыянальнасцяў. Напрыклад, адным з персанажаў, такім носьбітам мудрасці, з'яўляецца аптэкар-яўрэй Лейба. Культурная разнастайнасць сфарміравала ментальнасць беларуса: праслаўтая талерантнасць мае не толькі адмоўны сэнс, маўляў, «ешце мяне мухі з камарамі», як пісаў Уладзімір Караткевіч, але і станоўчы. Лёднік неяк агучвае словы Вальтэра: «Я не згодны ні з адным вашым словам, але гатовы памерці за ваша права яго гаварыць». Беларускае мястэчка — гэта касцёл, царква, сінагога і мячэць, і ўсе жыхары выходзяць гандляваць і святкаваць на адзін пляц. Не важна, якой чалавек канфесіі ці нацыянальнасці: калі ён жыве на гэтым месцы і гатовы яго абараняць, ён належыць народу, роўна як усе іншыя.

— А як было з патрыятызмам у XVIII стагоддзі?

— Было. Называлі сябе па-рознаму — русінамі ці ліцвінамі, але супольнасць была, была Беларусь, беларуская мова гучала напоўніцу, і магнаты ёй карысталіся. Лухта, што князі не маюць дачынення да Беларусі: мы маем права на ўсё, што тут адбывалася, і на ўсіх людзей, якія тут жылі і працавалі, і нам трэба сцвярджаць гэтае права, збіраць і ствараць нацыянальны міф. І князі, і рыцары, і дамы, і шляхта, і простыя людзі — усё тут было, і не хадзілі беларусы ў лапцях. У фільме персанажаў у лапцях няма — нават простыя беларусы ў той час насілі скураны абутак, які называўся поршнямі.

— У сферы беларускай літаратуры вы вядомы аўтар — ці значыць гэта, што літаратурай вы можаце сябе забяспечыць?

— Я вас прашу, літаратура сёння амаль нікога не забяспечвае, а пісьменнікаў, якія могуць жыць за кошт сваіх кніг, не можа быць шмат у прынцыпе. Гэтаму трэба адразу скарыцца і ні на што не разлічваць, інакш, пакуль будзеш чакаць, што прыйдуць-дадуць, нічога не зробіш. Калі я бяруся нешта пісаць, то з установакай, што гэта трэба толькі мне і яно можа трапіць «у стол», хоць, канешне, усё жыццё чакаю, што змагу нідзе не працаваць, а толькі пісаць мастацкія творы.

— Па вашых адчуваннях, наколькі шырокае чытацкае кола ў беларускамоўнай літаратуры?

— Кола чытачоў літаратуры, складанейшай за масавую, ніколі не будзе шырокае. У маім рамане «Сутарэнні Ромула» дзейнічае культавы беларускі пісьменнік — у яго ёсць прыхільнікі, ён падпісвае кніжкі, слухае пахвалы, а ўрэшце кажа: «Я ведаю, што мае чытачы могуць змясціцца на адной канапе». Ідучы ў літаратуру, трэба адразу разумець, што фанаты на вуліцы да цябе кідацца не будуць. Беларуская культура ўвогуле заўсёды стваралася высілкамі купкі энтузіястаў. Я пабачыла шмат цудоўных праектаў, зробленых за бясплатна, і людзі, гатовыя на такую працу, чамусьці не пераводзяцца.

— Ці будзе ў фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча» працяг?

— Карціну варта ўбачыць ужо толькі для таго, каб паглядзець, як у ёй сыгралі нашы акцёры. Ролю Лейбы выканаў народны артыст Аляксандр Ткачонак — у адной сцэне яго дапытваюць, дзе Лёднік, і ён з такой хітрасцю кажа: «А вось гэтага ніхто не ведае». З'яўленне другога фільма будзе залежыць ад поспеху першага, але сцэнарый ужо існуе, і гэтым разам я напісала яго сама.

Гутарыла
Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Кінакрокі

ПЕРАВЕСНАВАЦЬ

Беларускі фестываль прадставіць тры нацыянальныя прэм'еры

Чарговы кінафэст BelarusDocs, падчас якога можна на адмысловай платформе глядзець кіно анлайн, пройдзе з 7 да 13 красавіка і за гэты тыдзень пакажа сем беларускіх дакументальных фільмаў. Падзея адбудзецца ўжо трэці раз — папярэднія праходзілі ў 2016 і 2018 гадах, — але сёлета праз сітуацыю з каранавірусам прыйдзецца асабліва дарэчы. Трэці BelarusDocs да таго ж не толькі пакажа кіно, але і ўручыць нефармальны «Прыз глядацкіх сімпатый», у вызначэнні якога можа паўдзельнічаць кожны глядач.

Кадр з фільма «Дэбют».

Ініцыятыва вартая яшчэ і таму, што становіцца адной з нямногіх магчымасцяў беларусам убачыць айчынныя дакументальныя карціны, а сустракацца з такім запытам даводзіцца часта: док робіць сабе славу на міжнародных пляцоўках, атрымлівае прызы на замежных кінафестывалях і ўрэшце адлюстроўвае нашу рэчаіснасць, але амаль што недаступны звычайнаму гледачу.

Анлайн-кінафестываль разгорнецца на платформе belarusdocs.com: кожныя дваццаць чатыры гадзіны тыдня тут будзе даступны адзін фільм з праграмы. Некаторыя з іх ужо маюць фестывальны лёс, але будуць і нацыянальныя прэм'еры.

Часткай праграмы, напрыклад, стала стужка **«Дэбют» Настассі Мірашнічэнкі,** якая летась была вылучана на суісканне «Оскара» ад Беларусі і трапіла ў шорт-ліст прэміі. Прэм'ера фільма ў свой час адбылася на амстэрдамскім кінафестывалі IDFA, што лічыцца дакументальнымі «Канамі». Гэта аповед пра тэатр у жаночай папраўчай калоніі, які паралельна з рэпетыцыямі спектакля засяроджваецца на некалькіх гераінях і расказвае, як жанчыны перажываюць зняволенне — як яны працуюць, гадуюць у турме дзіця альбо чакаюць спаткання з малым, што застаўся на волі. Апроч даволі эмпатычнага пранікнення ў жаночыя гісторыі, карціна паказвае закрыты ад звычайнага чалавека турэмны быт і тое, як аматарская тэатральная пастаноўка разбаўляе стройную завязёнку.

Між тым адкрые BelarusDocs стужка **«Трэнер» Вольгі Абрамчык,** якая паказвалася на фестывалях Docudays у Кіеве, «Артдокфэст» у Маскве і мінскім «Лістападзе». Гэта пранікненне ў штодзённасць зборнай Беларусі па інтуітыўным футболе, дзе гуляюць невідушчыя, і яе самаадданага трэнера Алега Кірылава. Фільм суправаджае каманду ў яе падрыхтоўцы да адказнай гульні і ў тым ліку праз асобных гульцоў паказвае, як матывацыя і трэніроўкі спрыяюць, здавалася б, немагчымым рэчам.

У праграме кінафестывалю ёсць яшчэ два фільмы, раней ужо дэманстраваныя ў Беларусі. Цікавасць, па-першае, мусіць выклікаць **«Цар гары» Андрэя Куцілы,** зняты рэжысёрам яшчэ да яго вялікіх перамог з карцінамі «Стрыптыз і вайна» і Summa. Даволі каверзны фільм расказвае пра маладую сям'ю з малымі дзецьмі, што пераехала ў вёску з жаданнем займацца натуральнай гаспадаркай, але была хутка вымушана кінуць гэтую ідэю з-за бесперапынных бюракратычных працэдур і штрафаў.

Па-другое, на BelarusDocs можна пагрузіцца ў медытатыўна-назіральную работу **«Перазімаваць» Евы-Кацярыны Махавай,** дзе паказаны сезонны прытулак для старых людзей: на зіму яны пакідаюць свае адзіноkія вясковыя хаты і едуць у месца, уласна такую ж хату, дзе нехта можа пра іх паклапаціцца. Дні праходзяць няспешна і марудна, а камера тым часам выхоплівае ўспаміны старых пра гаротнае мінулае, іх стрыманую камунікацыю паміж сабой і непазбежнае затуханне.

Апроч больш-менш вядомых беларускаму гледачу стужак на BelarusDocs адбудуцца тры нацыянальныя прэм'еры карцін, кожная з якіх належыць масцітаму беларускаму дакументалісту і знятая на студыі «Летапіс» «Беларусьфільма».

У праграму ўключаны нядаўні док **Галіны Адамовіч «Лебедзі»,** што адлюстроўвае трэшавую работу хуткай дапамогі ў Светлагорску. Камера без літасці і паслабленняў накіроўваецца ў самую гушчу маргінальнага свету невялікага горада, якому штодзённа патрабуецца дапамога ўрача. Няпростае, а часам агіднае відовішча на прыкладзе светлагорскай «хуткай» — назва фільма адсылае да рабочага пазыўнога — пакажа, што ў рэальнасці можа азначаць клятва Гіпакрата.

Традыцыйная для нашай дакументалістыкі тэма вёскі мудрагеліста ўвасобілася ў фактурным фільме **«Полацкі вальс» Вольгі Дашук** пра вясковага гарманіста і кампазітара Васіля Граноўскага. Ён піша музыку па замовах, кіруе мясцовым хорам бабулек, возіць іх на выступленні і ўвогуле займаецца бурнай дзейнасцю ў даволі пашарпаным асяроддзі — і ў выніку сапраўды «робіць» фільм Вольгі Дашук. Цікавы сам па сабе герой становіцца правадніком у неналаджаныя, але сімпатычныя вясковыя будні, тут жа можна будзе пачуць музыку яго аўтарства.

Нарэшце, BelarusDocs пакажа зусім свежую карціну **«Фальклор і жыццё» Юрыя Цімафеева —** шэраг узноўленых акцёрамі нацыянальных рытуалаў і абрадаў. Фільм атрымаўся даволі гарэзлівы, бо беларускія традыцыі маюць справу і з фаласамі, і з аголенасцю, і са свабоднымі поглядамі на шлюб. Рознага кшталту рэканструкцыі мінулага, знятыя Юрыем Цімафеевым паэтычна і метафарычна, утвараюць яркае відовішча, з якога апроч іншага можна і пасмяяцца.

Фестываль з'яўляецца некамерцыйным праектам, таму яго можна падтрымаць на краўдфандынгавай пляцоўцы «Талака». За час двух мінулых «беларусдоксаў» чатырнаццаць праграмных фільмаў былі прагледжаны больш за дзевяць тысяч разоў у пяцідзесяці сямі краінах свету.

Для таго каб стаць сябрам журы, што прызначае Прыз глядацкіх сімпатый, трэба быць знаёмым з усімі сямю ўдзельнікамі праграмы.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Открытый аукцион №03/20 по продаже офисного помещения по адресу: г. Минск, ул. Ваупшасова, 10

Организатор аукциона	**ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, тел./факс: + 375 (17) 256-61-35**

Аукцион состоится 22.04.2020 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ООО «Астра-Лизинг»

№ лота	Предмет аукциона	Местонахождение	Площадь, кв. м	Начальная цена продажи долл. США с учетом НДС, *	Сумма задатка по лоту, руб.
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708127289 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС**	**г. Минск, ул. Ваупшасова, 10–154**	69,1	**45 710**	6 000

** расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи*

Порядок проведения и выбора победителя	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае, когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 17.04.2020 до 17.00**
Задаток	Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты: - для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22; - для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение платежа: «Задаток согласно извещению о проведении аукциона № 03/20 по лоту № 1»
Затраты	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 03/20. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.

КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА: + 375 (17) 256-61-35, + 375 (25) 549-86-22, Игорь Садливский, auction@expertiza.by
Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу http://www.expertiza.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Речицкий завод «Термопласт» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Олейника П. С. извещает о проведении 22 апреля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по ул. Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %) бел. руб.
	Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Лоты № 1–8 расположены на земельном участке с кадастровым номером **324550100001000008** площадью **2,3400 га,** предоставлен **ОАО «Речицкий завод «Термопласт»** на праве постоянного пользования. Целевое назначение земельного участка: размещение промышленных объектов. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст.19,45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **3.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %			
	Местонахождение лотов № 1–12: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 57			
1	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285190**, общей площадью **614,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание материального склада.** **Капитальное строение с инв. № 340/С-1847**, общей площадью **580,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Ограничение (обременение):** договор аренды № 4 от 09.10.2019 г., сроком действия по 08.10.2020 г., площадь, сданная в аренду, – **44,9 кв. м.** Забор железный с металлическими воротами – 66 п. м (инв. № 10). Система видеонаблюдения (инв. № 393). Канализационная сеть – 160 м (инв. № 11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 350 кв. м (инв. № 16)	**143 963,50**	7 198,18	14 396,35
2	**Капитальное строение с инв. № 340/С-299838**, общей площадью **936,7 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание цеха для размещения линий по переработке полимерсодержащих отходов и выпуску предизолированных труб.** Забор железобетонный – 126,5 п. м (инв. № 14). Канализационная сеть – 380 м (инв. №11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 1120 кв. м (инв. №16). Экструзионная линия для производства РЕ-труб 75 с зоной дегазации и сменной сетки на трубы D 75,90,110,160,200,250 мм, ЛТМО – 90х30-75\160 (инв. № 385). Экструзионная линия производства напорных труб для газопроводов, многослойных труб, для отопления из полиэтилена D 50,63,75,90,110,150 мм (инв. № 397). Линия экструзионная для производства РЕ-RT трубы (5-слойной) с защитным кислородным слоем (инв. № 398). Принтер капелеструйный Willet-430 (инв. № 400-А).Ограничение (обременение): **ипотека**	**1 050 647,50**	52 532,38	105 064,75
3	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285193**, общей площадью **357,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства полиэтиленовой пленки и полиэтиленовых труб № 1. Ограничение (обременение):** договор аренды № 1 от 29.01.2018 г., сроком действия по 15.09.2022 г., площадь, сданная в аренду, – **357,6 кв. м.** **Капитальное строение с инв. № 340/С-285196**, общей площадью **642,2 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства ТНП № 2. Ограничение (обременение):** договор аренды № 1 от 29.01.2018 г., сроком действия по 15.09.2022 г., площадь, сданная в аренду, – **642,2 кв. м.** **Капитальное строение с инв. № 340/С-285192**, общей площадью **275,0 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание бытовых помещений.** Линия для производства труб ЛТ-63х25 (инв. № 193). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 350 кв. м (инв. № 16)	**201 775,00**	10 088,75	20 177,50
4	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285194**, общей площадью **374,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции, наименование – **здание механической мастерской.** Забор железобетонный с металлическими воротами – 86 п. м (инв. № 14). Канализационная сеть – 20 м (инв. № 11). **Ограничение (обременение):** договор аренды № б/н от 11.11.2019 г., сроком действия по 10.11.2020 г., площадь, сданная в аренду, – **141,7 кв. м.** Ограничение (обременение): **ипотека**	**62 293,78**	3 114,69	6 229,38
5	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285195**, общей площадью **292,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание лесоцеха.** Забор железобетонный – 38 п. м (инв. № 14). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 270 кв. м (инв. № 16)	**43 243,94**	2 162,20	4 324,39
6	Водохранилище (кирпичное) (инв. №13). Забор железобетонный – 40 п. м (инв. № 14). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 10 кв. м (инв. № 16). **Ограничение (обременение):** договор аренды № 1 от 10.02.2015 г., срок действия по 16.12.2020 г., часть бетонированной площадки на территории предприятия	**3 220,00**	161,00	322,00
7	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285189**, общей площадью **807,2 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства ТНП № 1.** Забор железобетонный с металлическими воротами – 70 п. м (инв. № 14). **Ограничение (обременение):** договор аренды № 2 от 01.03.2017 г., срок действия по 16.12.2020 г., площадь, сданная в аренду, – **48,7 кв. м**	**95 906,10**	4 795,31	9 590,61
8	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285198**, общей площадью **457,0 кв. м,** назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства труб полиэтиленовых № 2.** Линия для производства труб 45-73 мм. ЛТМ-63х30 (инв. № 257). Забор железобетонный – 56 п. м (инв. № 14). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 140 кв. м (инв. № 16)	**108 974,88**	5 448,74	10 897,49
9	Котел водогрейный КВ-400\95Т (инв. № 377), 2009 г.в., мощность 400 кВт. Котел водогрейный (инв. № 374), 2008 г. в.	**9 100,00**	455,00	910,00
10	Теплотрасса (инв. № 12), 1984 г. в.	**78 000,00**	3 900,00	7 800,00
11	Станок правильно-отрезной 1Д-162-01 (инв. № 331), 1992 г. в.	**5 500,00**	275,00	550,00
12	Агломератор А02.00.00.000 (инв. № 358), 2004 г. в., мощность привода 15 кВт	**3 100,00**	155,00	310,00

Продавец: ОАО «Речицкий завод «Термопласт», ул. Чапаева, 57, 247500, Гомельская область, г. Речица. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 554-10-33 управляющий в деле о банкротстве Олейник Павел Станиславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 21 марта 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 20 апреля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст.127–129.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» за 2019-й год

Адрес: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20, УНП 100036332.

Информация об ОАО и его деятельности по состоянию на 01 января 2020 года:

Количество акционеров всего: 555, в том числе: юридические лица – 2, из них нерезидентов Республики Беларусь – 1, физические лица – 553, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0;

Доля государства в уставном фонде общества – нет;

Сведения о юридических лицах, участником которых является общество – нет;

Начислено на выплату дивидендов – 0;

Фактически выплаченные дивиденды – 0;

Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) – 0,

Обеспеченность акции имуществом общества – 0,17 руб.;

Акции, находящиеся на балансе общества – 0;

Выручка от реализации товаров, работ, услуг – 506 тыс. руб.;

Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию – 528 тыс. руб.;

Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) – 10 тыс. руб.;

- в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг – (-22) тыс. руб.;

- прочие доходы и расходы по текущей деятельности – (-8) тыс. руб.;

- прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности – 40 тыс. руб.;

Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) – 2 тыс. руб.;

Чистая прибыль (убыток) – 8 тыс. руб.;

Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) – (-741) тыс. руб.;

Долгосрочная дебиторская задолженность – 0;

Долгосрочные обязательства 2948 тыс. руб.;

Среднесписочная численность работающих: 16 чел.;

Основные виды деятельности, по которым получено 20 % и более выручки: сдача в наем недвижимого имущества 85,8 %, сдача в аренду транспортных средств 13,8 %.

Годовое общее собрание акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2019 год, состоялось 17.03.2020.

Аудиторское заключение за период с 0.01.2019 по 31.12.2019 подготовлено 20.02.2020 индивидуальным предпринимателем Берёзка Ириной Анатольевной, 220018, г. Минск, ул. Одинцова, д. 7, кв. 135, зарегистрирована 01.08.2013, регистрационный номер 192023084, в полном объеме опубликовано 18.03.2020 на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг.

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности – бухгалтерская (финансовая) отчетность сформирована в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 01.01.2020 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2019 г., при этом совершенные финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Свод правил корпоративного поведения принят к сведению наблюдательным советом, сообщения о проведении собрания содержат достаточную информацию для принятия решения об участии в нем, информация, предоставляемая при подготовке к проведению собрания позволяет получить полное представление о деятельности общества и принять обоснованное решение по вопросам повестки дня; информация своевременно раскрывается на ЕПФР и в общедоступном СМИ – газете «Звязда».

Сайт общества в сети Интернет – нет.

Управляющий А. Н. Червонец

ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8. Тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Первые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **6 апреля 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. Срок приема заявок и задатков с 22.03.2020 г. 09.00 по 04.04.2020 г. до 17.00. Предмет торгов – **изолированное помещение с инв. № 500/D-70791461, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Советская, д. 8, пом. 2Н, площадь – 801,8 кв. м,** назначение/наименование – административное помещение (в здании, являющимся недвижимой историко-культурной ценностью). Начальная цена – 3 601 920,00 бел. руб. с НДС. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано на сайте bankrot.gov.by.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **21 апреля 2020 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. Срок приема заявок и задатков с 22.03.2020 г. 09.00 по 20.04.2020 г. до 17.00. Предмет торгов – **производственная база, расположенная по адресу: г. Гомель, ул. Шоссейная, д. 9**. Начальная цена – 2 505 000,00 бел. руб. с НДС. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в установленный срок: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ДАТЧ СТАР»,

опубликованной в газете «Звязда» 25.10.2018 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» (I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1–3) – (II очередь строительства, секции 1–3).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагается:

1 (одно) нежилое помещение, расположенное на 1-м этаже по принципу «свободной планировки» площадью от 99,99 кв. м: стоимость 1 кв. метра – от 1300 до 1500 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, помещение 860.

Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000. УНП 191061436

Частное предприятие «ЭАТЭП»

сообщает о проведении 24.04.2020 торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества (с обременением):

1. Изолированное помещение (офисы) с инв. № 500/D-7060727 (общ. пл. 23,2 кв. м), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 185, пом. 65Н – 88 300,00 бел. руб.
2. Автомобиль легковой VOLKSWAGEN PASSAT – 8 876,00 бел. руб.
3. Автомобиль легковой VOLKSWAGEN Transporter T5 – 9 956,00 бел. руб.
4. Автомобиль легковой Mitsubishi outlander – 17 451,00 бел. руб.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by**. УНП 691893812

СУСВЕТНАЯ ДЭПРЭСІЯ

Чым пагражае глабальны крызіс?

Інвестыцыйныя банкі Goldman Sachs і Morgan Stanley абвясцілі пра пачатак глабальнага крызісу, піша Bloomberg. На думку спецыялістаў, цяпер гаворка ідзе аб глыбіні і магчымай працягласці падзення. Эканаміст Чэтан Ах'я адзначыў, што разглядае рэцэсію як базавы сцэнарый для глабальнай эканомікі ў 2020 годзе. Сусветныя фінансавыя рынкі цяпер у фазе фарміравання дна, таму інвестарам варта ўзмацняць пазіцыі на рынку рызыкоўных актываў і прадаваць долары, лічаць аналітыкі Morgan Stanley. Чаго магчыма чакаць надалей?

РЭКОРДНЫ СПАД

Каранавірус паставіў сусветную эканоміку на мяжу крызісу, які можа аказацца самым сур'ёзным за стагоддзе. Цяперашні эканамічны спад здольны аказацца больш разбуральным для дабрабыту насельніцтва планеты, чым фінансавы крах дзесяцігадовай даўніны. Тады заглухлую банкаўскую сістэму запусцілі цэнтрабанкі, надрукаваўшы грошай. Цяперашні крызіс падарваў усю эканоміку: і вытворчасць, і сектар паслуг, і попыт, таму патрэбныя мэтавыя інтэрвенцыі, на што давядзецца «скінуцца». «Гэтым разам праблема ў іншым — перабоі ў рэальнай эканоміцы. І яе немагчыма ліквідаваць выключна сіламі цэнтральных банкаў», — заўважыў Руперт Харысан з найбуйнейшага ў свеце інвестфонду BlackRock.

Як адзначаюць аналітыкі, антыкрызісныя інструменты, распрацаваныя пасля крызісаў сусветнай фінансавай сістэмы і еўразоны, прызначаныя для барацьбы з праблемамі зусім іншага клопату. Гэтым разам усё інакш. Уладам усіх краін свету давядзецца выдаткаваць сотні мільярдаў долараў сродкаў падаткаплацельшчыкаў, каб не столькі ліквідаваць прычыну крызісу — спыніць эпідэмію, колькі выправіць наступствы — падтрымаць пацярпелых людзей і бізнес. З гэтым могуць узнікнуць праблемы: дзейнічаць трэба хутка, рашуча, затратна і пажадана ў каардынацыі з суседзямі, што палітыкам многіх краін даецца з цяжкасцю.

ЯК ВЫЙСЦІ З КАРАНЦІНУ?

Краінам ЕС давядзецца выдаткаваць за год каля 350 мільярдаў долараў на ліквідацыю наступстваў месячнага каранціну, падлічыла адна група эканамістаў. На што пойдуць гэтыя грошы? На тры асноўныя рэчы: падтрымку аховы здароўя, людзей і бізнесу. Першае дазволіць справіцца з эпідэміяй, другое — падтрымаць попыт у эканоміцы і сацыяльную стабільнасць, трэцяе — адрадзіць прапанову тавараў і паслуг. Дзяржпадтрымка спатрэбіцца як людзям, якія пазбавіліся заробку з-за каранціну, так і кампаніям, якія страцілі рабочую сілу, пастаўшчыкоў і спажыўцоў. Яна можа быць аформлена ў выглядзе бюджэтных субсідый, падаткавых прэферэнцый і грашовых кампенсацый. Сацыяльныя выдаткі многіх краін вырастуць, калі ўлады аслабяць палітыку на час крызісу, напрыклад, павялічаць дапамогі па беспрацоўі і пашыраць кола людзей, якія маюць права на гэтыя і іншыя выплаты, напрыклад, аплатныя бальнічныя.

Бізнес ужо б'е трывогу, і з першых крыкаў аб дапамозе ясна, што гаворка ідзе не толькі пра страты прыбытку. Мільёны чалавек пазбавяцца работы, тысячы фірмаў збанкрутуюць. Улады стаяць перад няпростым выбарам: падтрымаць бізнес зараз ці потым дапамагаць беспрацоўным, ды яшчэ і ва ўмовах, калі ў казне ўсё менш грошай з-за скарачэння падатковых паступленняў.

ЧАРГА ПА ДАТАЦЫІ

На перадавой крызісу цяпер турызм і авіяцыя. Сусветны савет па падарожжах і турызме (World Travel & Tourism Council (WTTC) папярэдзіў, што пандэмія можа сёлета пазбавіць галіну 50 мільёнаў рабочых месцаў і скараціць рынак турпаслуг на чвэрць. Толькі ў Іспаніі ў лютым запаўняльнасць гасцініц упала на 20—30 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Яшчэ да поўнага лакдаўна атэлі Мадрыда страцілі кожнага чацвёртага пастаяльца, а Барселоны — кожнага пятага.

Авіякампаніі рэзка скарацілі перавозку пасажыраў, спачатку ў Азію, а потым і ў ЗША і Еўропу. Яны не скупяцца на эпітэты, кажуць пра найгоршы крызіс у гісторыі грамадзянскай авіяцыі і ўжо папрасілі аб мільярднай дапамозе ва ўрадаў, хоць большасць забарон на палёты яшчэ не ўступіла ў сілу.

Пад пагрозай уся сфера паслуг: ад рэстаранаў і кінастудый да ўніверсітэтаў і таксі. Вялікі спорт пазбавіўся мільярдных прыбыткаў ад трансляцый і продажу білетаў. У чаргу па датацыі выстраіліся нават нафтагазавыя кампаніі, збянтэжаныя абвалам попыту і цэн на нафту. І гэта толькі пачатак. Пакет бюджэтнай дапамогі ў ЗША прайшоў толькі ніжнюю палату Кангрэса, і яго аб'ём вядомы толькі прыблізна: дакладна больш за 10 мільярдаў долараў, але, напэўна, менш за $50 млрд, пра якія казаў прэзідэнт Дональд Трамп. ЕС паабяцаў выдзеліць каля 40 мільярдаў еўра. Пацярпелая больш за іншых Італія — да 25 мільярдаў еўра, Швейцарыя і Паўднёвая Карэя — па 10 мільярдаў долараў, Егіпет — 6 мільярдаў, Францыя, Аўстралія, Новая Зеландыя і Японія паабяцалі зрабіць «усё магчымае», каб падтрымаць эканоміку за кошт казны. Кітай запусціў маштабную праграму стымулявання вытворчасці за кошт падатковых паслабленняў і льготных крэдытаў.

І гэта пры тым, што ні адна з гэтых краін пакуль не сутыкнулася ў поўнай меры з наступствамі крызісу. А яны будуць вельмі сур'ёзныя, цытуе Бі-бі-сі меркаванне эканаміста Махамеда эль-Эрыяна, які працаваў на кіруючых пасадах у МВФ і ў адміністрацыі Барака Абамы, а таксама ў інвестфондзе Pimco і страхавой кампаніі Allianz. «Мы жывём у глабальнай эканоміцы, заснаванай на ўзаемазвязанасці. Але раптам ахова здароўя запатрабавала ад нас сацыяльнай раз'яднанасці, падзелу і ізаляцыі. Гэта супярэчыць усяму таму, што ляжыць у аснове эканамічнага росту, дабрабыту і фінансавай стабільнасці», — апісаў эль-Эрыян перадумовы для паглыблення крызісу.

МІНУС 4 ТРЫЛЬЁНЫ

Да прыходу каранавіруса эканамісты чакалі сёлета росту сусветнай эканомікі прыблізна на тры працэнты. Цяпер яны прадказваюць рэцэсію і разыходзяцца толькі ў ацэнках яе працягласці — усё залежыць ад таго, як будзе развівацца пандэмія.

Калі па выніках года эканоміка так і не вырасце, свет недалічыцца прыкладна 4 трыльёнаў долараў. Гэта больш за ВУП Германіі, найбуйнейшай эканомікі Еўропы, і ў два з паловай разы больш за ВУП Расіі.

З трох вядучых сусветных эканомік — ЗША, Еўрасаюза і Кітая — дзве яшчэ разлічваюць на прырост багацця, хай і меншы, чым чакалася, а адна — ЕС — поўным ходам рыхтуецца зацягваць паясы. Еўрапейскія чыноўнікі яшчэ ў пачатку сакавіка казалі, што свежыя ацэнкі прадказваюць спад па выніках года. Эканоміка ЗША, найбуйнейшая ў свеце, пакуль на шляху да росту, але і ў Амерыцы эканамісты паступова пачынаюць пераглядаць прагнозы. У сакавіцкім апытанні Чыкагскага ўніверсітэта яны аказаліся крыху мякчэйшыя, чым у еўрапейскіх калег: 62 % бачаць імавернасць маштабнай рэцэсіі ў свеце з-за каранавіруса супраць 82 % еўрапейскіх эканамістаў, пераважна зачыненых дома на каранціне.

Паколькі на ЗША, Кітай і ЕС прыпадае дзве траціны эканамічнай актыўнасці ў свеце, то спаду ў Еўропе і істотнага запаволення ў Кітаі будзе дастаткова для тармажэння ўсёй глабальнай эканомікі. А калі дадаць сюды пагрозу сыравінным краінам ад падзення цэн на нафту і металы, карціна становіцца яшчэ больш змрочная. Маштаб праблем на Захадзе пакуль не адлюстраваны ў статыстыцы, але пра яго можна прыблізна меркаваць па апераджальных індыкатарах з Кітая, дзе ў лютым замерла актыўнасць як у прамысловасці, так і ў сектары паслуг.

НАПЯРЭДАДНІ ДЭФОЛТАЎ

У агляднай перспектыве дэфолты могуць абвясціць адразу некалькі краін. Пра гэта заявіў кіраўнік аддзела рынкаў у J. P. Morgan International Дэвід Стабс. Па словах аналітыка, у апошнія дзесяцігоддзі многія дзяржавы аб'яўлялі аб тым, што адмаўляюцца выконваць даўгавыя абавязацельствы. Газета The Independent паведаміла, што эканаміст Джэсі Каломба, які прадказаў крызіс 2008 года, папярэдзіў пра новую фінансавую катастрофу. На думку амерыканскага эксперта, цяпер на сусветным рынку ёсць адразу некалькі бурбалак, якія могуць лопнуць у любы момант.

Зрэшты, прароцтвы пра новы сусветны фінансавы крызіс гучаць ужо не першы год. У ліпені 2018-га аналітыкі Bank of America адзначалі, што актуальная дынаміка на сусветным фондавым рынку падобная на тую, што была перад сусветным эканамічным крызісам у 1997–1998 гадах. А летась амерыканскі мільярдэр, заснавальнік інвестыцыйнай кампаніі Bridgewater Associates Рэй Даліа ацаніў стан сусветнай эканомікі і прыйшоў да высновы, што новы фінансавы крызіс можа надысці ў найбліжэйшыя некалькі гадоў. «Перыяд, у якім мы знаходзімся, вельмі падобны на 30-я гады мінулага стагоддзя», — сказаў Даліа, адзначыўшы падабенства актуальнай эканамічнай і палітычнай абстаноўкі з часам Вялікай дэпрэсіі ў ЗША. Ці спраўдзяцца гэтыя прагнозы, стане вядома ўжо ў найбліжэйшы час.

Захар БУРАК.

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков

№ лота	Наименование объекта/адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке в связи с его расположением
1	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Жабинка, ул. Муховецкая, 1** и земельный участок	122550100001002737	0,1500	9 329,34	1 024,41	1 800,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хоз.-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - на мелиоируемых (мелиорированных) землях на всей площади; - в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0109 га
2	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Жабинка, ул. Белорусская, 5** и земельный участок	122550100001000201	0,1350	12 395,89	1551,12	2 400,00	- в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0022 га; - в водоохранной зоне р. Жабинка на всей площади
3	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в Жабинковский с/с, **д. Нагораны, ул. Брестская, 14** и земельный участок	122580605101000008	0,1929	4 976,59	1 965,87	900,00	- в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0163 га
4	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в Жабинковский с/с, **д. Зеленковщизна, ул. Центральная, 8** и земельный участок	122580604101000008	0,2387	5 561,63	1 749,70	1100,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Жабинка) на всей площади; - на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хоз.-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - на мелиоируемых (мелиорированных) землях на всей площади

***Целевое назначение использования участков* – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома**

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — 2 700,00 рубля

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»

задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с №BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000

Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и земельный участок предоставляются в частную собственность победителю аукциона, либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, с условиями:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- внесения части платы за предмет аукциона за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом на расчетный счет соответствующего сельского (районного) исполнительного комитета;

- внесения части платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки, предыдущему владельцу;

- возмещения расходов, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсирования организатору аукциона затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;

• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Жабинковский исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;

• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок Жабинковское бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся

Аукцион состоится 22 апреля 2020 г. в 10.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 23.03.2020 г. до 17.00 16.04.2020 г. (время работы с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00; вых.: суб, вс.) по адресу: г. Жабинка, ул. Свободы, 6а. Контактные телефоны: 8 (01641) 32337, 8 (01641) 32546. Сайт: www.gki.gov.by

Вольга ЯСЯНОВІЧ:

«Яны самі не ўяўляюць, як хутка могуць плаваць»

Пра трэнерскую работу і сваю вядомую выхаванку Настассю Шкурдай расказвае адзін з самых паспяховых маладых настаўнікаў краіны

Вольга ЯСЯНОВІЧ нарадзілася ў Барысаве, займалася плаваннем у адзіным басейне горада, а потым пераехала ў Мінск. Але ў 18 гадоў, калі яе спартыўныя дасягненні спыніліся, дзяўчына перайшла ў падводнае плаванне, дзе заваёўвала медалі этапаў Кубка свету і іншых міжнародных турніраў. Каб зарабляць на жыццё ў сталіцы, Вольга пачала трэніраваць дзяцей, а потым пераехала ў Брэст, дзе будаваўся вялікі цэнтр водных відаў спорту. Напачатку ёй даводзілася жыць проста на рабоце, але затое са сваёй першай жа групы малады трэнер выгадавала чатырох майстроў спорту, а яе выхаванка Настасся Шкурдай стала самым маладым у гісторыі беларускага плавання майстрам спорту міжнароднага класа. Да сваіх 16 гадоў Настасся пад кіраўніцтвам Вольгі ўстанавіла некалькі рэкордаў краіны, стала чэмпіёнкай Еўропы сярод юніёраў і дарослых, а сёння яны разам ужо рыхтуюцца да Алімпіяды ў Токіа. Пра тое, як трэніраваць не толькі дзяцей, але і іх бацькоў, пастаянна самаўдасканальвацца і знаходзіць агульную мову з дзецьмі на працягу дзевяці гадоў работы, Вольга расказала ў сваім інтэрв'ю.

«Ва ўніверсітэце нас шмат чаму вучаць, шмат чаму мы самі не вучымся»

— Вольга, раскажыце пра сваю работу цяпер. На кім сканцэнтравана ваша ўвага?

— На цяперашні момант у мяне толькі адна група — вышэйшага спартыўнага майстэрства. Мне хацелася б працаваць і з іншымі дзецьмі, і я дапамагаю сваёй калежанцы, калі знаходжуся ў Брэсце. Але праз тое, што адна з маіх выхаванак, Настасся Шкурдай, паказвае такія высокія вынікі, я вельмі часта знаходжуся з ёй на зборах. Каб адпавядаць узроўню, Насці трэба спрабаваць плаваць у такіх жа ўмовах і з такімі ж моцнымі спартсменамі. А працаваць з дзецьмі, калі ты ўвесь час з'язджаеш, вельмі складана, таму ад іншых груп я адмовілася.

— Цяперашняя група — гэта ваш першы самастойны набор дзяцей?

— Я пачала трэніраваць іх, калі сама яшчэ займалася спортам, таму што трэба было неяк зарабляць у Мінску. Мне тады было 19—20 гадоў. Вельмі падабалася гэтая работа, вялікі дзякуй маім трэнерам, бо яны сваім станоўчым прыкладам паказвалі, што праца трэнера — гэта вельмі нядрэнная работа. Хоць сёння я здзіўляюся людзям, якія ў гэтай прафесіі ўсё жыццё, — мне здаецца, што сілы заканчваюцца ўжо цяпер *(усміхаецца)*. Ва ўніверсітэце нас шмат чаму вучаць, шмат чаму мы самі не вучымся, але, улічваючы сённяшнюю канкурэнцыю ў сусветным спорце, трэнер павінен быць вельмі адукаваным чалавекам. А лепш, калі са спартсменам працуе не адзін спецыяліст, бо атлет мае патрэбу і ў псіхолагу, і ў трэнеру па фізічнай падрыхтоўцы. На пачатковым узроўні тваіх ведаў хапае, але далей вельмі многае трэба мяняць у сабе і вельмі шмат чаму вучыцца.

Група, з якой я працую цяпер, — гэта сапраўды мой першы набор дзяцей у Брэсце. Я вяду іх ужо 8—9 гадоў, яны прыйшлі да мяне, наогул не ўмеючы плаваць, пускалі бурбалкі і вучыліся проста ляжаць на вадзе, а дараслі да ўзроўню майстроў спорту.

— Прыемна назіраць за такім іх станаўленнем?

— Дзеці прыходзяць, не ўмеючы рабіць нічога, але першыя 2-3 гады ў іх усё атрымліваецца, прагрэс вялікі і пастаянны. Тут ён не ўмеў ляжаць на вадзе, а тут ужо паплыў, навучыўся плаваць двума спосабамі, чатырма. Гэта цяжкая праца, таму што ўсе дзеці розныя, але за прагрэсам заўсёды вельмі прыемна назіраць. Цяпер ім якраз па 16 гадоў, пераходны ўзрост, яны ўжо дайшлі да пэўнага ўзроўню, і вынік паляпшаць значна складаней. Тут ужо пачынаецца зусім іншая праца, таму што ты не бачыш такога хуткага прагрэсу. З часам трэнер сутыкаецца з цяжкімі рэаліямі. Калі ў дзяцей перастае штосьці атрымлівацца, большасць здаецца на паўдарозе, таму надыходзяць такія перыяды, калі трэба пацярпець, перачакаць. А цярпець заўсёды вельмі складана і мне, і ім.

— Як вы шукаеце для іх матывацыю?

— Мы з вамі раслі ў іншы час. Калі я займалася плаваннем, мне ніхто не шукаў матывацыю, проста хацелася плаваць, да таго ж усе ведаюць, што гэта карысна для здароўя. Я родам з Барысава, дзе быў адзін маленькі басейн на ўвесь горад, і ўмовы там вымушалі жадаць толькі лепшага — дарэчы, цяпер яны не надта змяніліся. Каб дасягнуць выніку, трэба было перабірацца ў Мінск. У цяперашніх дзяцей усё зусім інакш — у Брэсце створаны вельмі добрыя ўмовы, нават нацыянальная каманда праводзіць свае зборы тут. Для дзяцей ствараюцца льготы для паступлення ў навучальныя ўстановы па спартыўным кірунку, арганізаваны іх адвоз у вучылішча, іх кормяць, ім дадзены нерэальныя залы з кваліфікаванымі спецыялістамі. Толькі займайся! А займаючыся добра, ты можаш выйграваць спаборніцтвы, і гэта будзе прыносіць фінансавы прыбытак. Цяпер праводзіцца сусветная ліга плавання, дзе спартсмены зарабляюць вельмі добрыя прызавыя, дзякуючы гэтай лізе фінансавае заахвочванне з'явілася і на чэмпіянаце свету. Гэта значыць, плаванне становіцца і хобі, і работай, а калі за любімую справу ты яшчэ і грошы атрымліваеш, па-мойму, гэта вельмі добрая матывацыя.

«За любым спартсменам стаяць моцныя бацькі»

— Наколькі вялікую ролю іграюць бацькі ў станаўленні спартсмена?

— Вельмі вялікую. Раней я часта збірала бацькоў і заўсёды іх прасіла знайсці час і прачытаць кнігу пра біяграфію якога-небудзь вядомага спартсмена, звярнуць увагу на тое, што за любым спартсменам стаяць бацькі. Можа быць, бабуля ці дзядуля, але хтосьці вельмі моцны. Напрыклад, Насці вельмі пашанцавала з бацькамі ў гэтым плане, яны ніколі не прымушалі яе выбіраць толькі вучобу і абмяжоўваць сябе ў басейне. Даможацца дзіця выніку ці не, шмат у чым залежыць менавіта ад бацькоў, хоць часам здаецца — лепш бы яны не бралі такога актыўнага ўдзелу, моцна ўмешваючыся ў трэніравальны працэс. Але дапамога бацькоў і іх разуменне юным спартсменам вельмі патрэбныя.

— Вы чакалі, што са сваім першым жа наборам у такім маладым узросце для трэнера (Вользе ўсяго 32. — Аўт.) даможацеся такога высокага выніку?

— Гэта была мая мэта. Я заканчвала сваю спартыўную кар'еру, назапасіўшы пэўны вопыт, разумела, чаго мне не хапіла для большага поспеху і таму прыблізна ведала, як рэалізаваць гэта ў дзецях. Прыехаўшы ў Брэст, я атрымала магчымасць бясплатна набіраць дзяцей і працаваць без абмежаванняў: вады далі колькі трэба, залы — якія трэба. Было складана, таму што нейкі час я жыла ў басейне, але затое было вельмі шмат часу на самаўдасканаленне. Я прыкладала максімум намаганняў, чытала замежную літаратуру, інтэрнэт, пастаянна з кімсьці мела зносіны, потым з'явілася магчымасць выязджаць за мяжу. Самае распаўсюджанае пытанне ад журналістаў: ці бачыла я па дзецях, што з іх атрымаецца нешта талковае? Не, не было нічога відаць, былі дзеці значна больш сімпатычныя ў плане перспектывы спартыўнага выніку, чым тая ж Насця, больш гнуткія, больш хуткія, але ў розныя перыяды часу не знайшлося кантакту з бацькамі, хтосьці не захацеў рана раніцай прыходзіць на трэніроўкі, камусьці не хапіла характару, імкнення, жадання.

Самы складаны момант з матывацыяй, на мой погляд, надыходзіць, калі дзеці вучацца ў 5 класе. Яны і іх бацькі стаяць перад выбарам: пайсці ў гімназію або ў спартыўны клас. Таму што калі вучышся ў звычайнай школе, вельмі складана дасягнуць высокага выніку ў спорце. У нас у краіне чамусьці існуе такі стэрэатып, што спорт — гэта для не вельмі высокаразвітых дзяцей, хоць рэальна гістарычна ў свеце плаванне — гэта від спорту для арыстакратаў, дазволіць яго сабе маглі толькі вельмі забяспечаныя, адукаваныя людзі. Ну і ў прынцыпе, маючы магчымасць бачыць спартсменаў высокага ўзроўню, магу сказаць, што дурных людзей там няма, ёсць атлеты і не з адной вышэйшай адукацыяй. Гэта яшчэ вялікае пытанне, што больш дае дзіцяці: школьная адукацыя або той жа спорт, калі ў 15 гадоў ты маеш магчымасць ездзіць за мяжу, глядзець свет і пераймаць вопыт. У ЗША, напрыклад, спорт — гэта, наадварот, рэальная магчымасць атрымаць бясплатную адукацыю, таму бацькі самі тлумачаць дзецям, чаму ім трэба займацца. У нас жа трэнеру часта даводзіцца працаваць не толькі з дзецьмі, але і з бацькамі — скажу шчыра, у маёй дзейнасці гэта самая нелюбімая справа.

— Вы строгі трэнер?

— Дзеці адказалі б — так. Гэта вялікая праблема цяпер, мне б вельмі хацелася змяніць стыль работы з аўтарытарнага на больш дэмакратычны, але чамусьці, калі ты прыходзіш і ўключаеш сяброўскую размову, дэмакратыю, у дзяцей знікае самадысцыпліна, яны пачынаюць не вельмі якасна працаваць. А з-за гэтага могуць адбыцца непатрэбныя траўмы, праблемы. Мая строгасць у першую чаргу накіравана на тое, каб на трэніроўцы была дысцыпліна. Часам даводзіцца павысіць голас, толькі пасля гэтага ўключаецца адэкватнасць, але, спадзяюся, па меры сталення дзяцей, мы знойдзем з імі кампраміс, і мне менш давядзецца ўключаць аўтарытарнае кіраванне.

— Выхаванцы могуць прыйсці да вас па параду па-за спортам?

— Шчыра кажучы, у гэтым ёсць складанасць. Бацькам я адразу кажу: я не тата і не мама для дзяцей, у іх ёсць вы, і вы павінны выконваць сваю ролю. Я магу даць параду сама, калі бачу, што ў ёй ёсць неабходнасць. Напрыклад, мы можам пагаварыць пра паступленне ў ВНУ, а вось абмяркоўваць асабістыя пытанні пакуль няма неабходнасці, хоць я заўсёды адкрытая для зносін.

— Што складаней перажываць з вучнямі, іх перамогу ці паражэнне?

— Вядома, цяжэй перажыць поспех. Калі ёсць нейкая няўдача, ёсць шмат пытанняў для разваг пра тое, што ты зрабіў не так. Тут усё даволі проста, ты ставіш мэту, робіш работу над памылкамі і ідзеш далей. Заўсёды кажу, што любы старт — гэта толькі рэалізацыя працы, якую ты зрабіў. Але калі здараюцца вялікія перамогі — гэта заўсёды вельмі складана, таму што ў большасці пачынаецца расслабленне, а сабрацца зноў заўсёды вельмі складана. Камусьці потым складана паставіць новую мэту, і тут ізноў жа даводзіцца ўключаць строгасць, тлумачыць, але, падумаўшы, дзеці згаджаюцца са мной і працягваюць працаваць.

«Насця — не проста таленавітая дзяўчынка з вялікім памерам ступні»

— Настасся Шкурдай ужо выступае за нацыянальную зборную, але вы па-ранейшаму застаецеся яе асабістым трэнерам?

— Так, Насця прыйшла да мяне ў сем гадоў, у яе дзве выдатныя бабулі, цяпер ёй вельмі дапамагае тата. Мы трэніруемся заўсёды разам і на спаборніцтвы ездзім таксама разам, каб не дапусціць ператрэніроўкі ў такім юным узросце, зрыву адаптацыі арганізма. Пакуль яшчэ ёсць вельмі шмат пытанняў, якія трэба кантраляваць, таму мы прынялі рашэнне, што будзем працаваць так.

— Яна досыць рана пачала паказваць высокія вынікі.

— Не раней, чым хтосьці іншы. У прынцыпе калі дзіця ў 12 гадоў не паказвае пэўнага ўзроўню рэзультатаў, то гэта не вельмі добра. Я не кажу пра тое, што трэба выйграць чэмпіянат Еўропы ці яшчэ штосьці, але паказваць пэўны час за кошт узроўню тэхнікі плавання трэба. Мы чулі шмат каментарыяў: маўляў, фарсіруем падрыхтоўку, або рана пачне — рана скончыць. Часцяком дзеці самі не разумеюць, які велізарны ў іх патэнцыял, з Насцяй тое ж самае. У яе ёсць вельмі добрая здольнасць вытрымліваць працу, а многія дзеткі вельмі любяць сябе шкадаваць. У Насці ёсць сіла волі, характар, яна можа прыкласці пэўныя намаганні, а потым перанесці іх у вынік, хоць часам яна сама не ўяўляе, як хутка можа плаваць.

— Збоку яна здаецца вельмі замкнёным чалавекам, дае мала інтэрв'ю. Якая Насця на самай справе?

— Так здаецца толькі з боку, Насця вельмі таварыская дзяўчынка, для свайго ўзросту вельмі разумная, у яе вельмі шмат правільных думак. Яна чытае добрыя кнігі, таму добра падкаваная, эрудзіраваная. Адзіная праблема, на мой погляд, — гэта тое, што яна не вельмі імкнецца вучыць англійскую мову. Хоць у Насці вельмі шмат сяброў за мяжой. Прыязджае на спаборніцтвы — і ёй размінацца няма калі, таму што ўсе хочуць з ёй пагаварыць. Часам даводзіцца ўключаць злога трэнера і стаяць над ёй. А гэтая закрытасць — проста браня, асабліва цяпер: чым большы ў яе вынік, тым больш людзей пачынае збірацца вакол, не столькі жадаючы дабра, колькі атрымаць якую-небудзь выгаду. Такія паводзіны ад таго, што Насця хоча абараніць сябе ад непатрэбных людзей і трымаць дыстанцыю. Яна вельмі добры чалавек, і ў пачатку ёй гэта давалася няпроста, яна баялася кагосьці пакрыўдзіць, адмовіць, пакуль не зразумела, што тым самым ушчамляе сябе ў асабістай прасторы, адпачынку і не клапоціцца пра сваё здароўе.

— Алімпійскія гульні ў Токіа могуць стаць для Насці першымі ў кар'еры, калі адбудуцца...

— Мы працуем у сваім рэжыме — не будзе гэтай Алімпіяды, будуць іншыя спаборніцтвы. Для кагосьці гэтыя Гульні стануць апошнімі, бо спартсмены рыхтуюцца не чатыры гады, а ўсе восем і дванаццаць. Але гэта паказвае нам тое, што нельга засяроджвацца толькі на чымсьці адным, трэба заўсёды мець запасны план. У прынцыпе цяпер у плаванні ідзе такая тэндэнцыя, што спартсменам трэба хутка плыць не раз на чатыры гады, таму што ёсць і этапы Кубка свету, і чэмпіянаты свету, ёсць спаборніцтвы, якія прыносяць прыбытак, таму сёння ў нашым відзе спорту цалкам змяняюцца сістэмы падрыхтоўкі, трэніроўкі, патрабаванні да сябе, павышаюцца ўзровень канкурэнцыі, патрабаванні да фізічнай гатоўнасці.

— Якія задачы вы ставіце перад Насцяй на Алімпійскія гульні?

— Задача заўсёды адна: паказаць пэўны час, а не выйграць медаль. Ёсць раскладка, трэба праплысці па такім і такім выніку. Гэта ўсё — лічбы, тэмп, хуткасць, грабкі — распісана ў дзённіку кожнага спартсмена. Мы хацелі б выплыць з часу 57 секундаў — цяпер яе найлепшы вынік 57,3 секунды. Вынік Насці — гэта не цуд, гэта праца велізарнай каманды. Яна не проста таленавітая дзяўчынка з вельмі вялікім памерам ступні або рукі, проста даныя — гэта мала, трэба навучыць дзіця імі карыстацца.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ,
г. Брэст.

Алімпіядзе быць

Каранавірус пагражае Гульням у Токіа

Як адмянялі і пераносілі падобныя турніры ў іншыя часы

Ужо некалькі месяцаў усе сусветныя навіны не могуць абысціся без тэмы каранавіруса. Пандэмія з'явілася прычынай адмены шматлікіх палітычных, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў. Але Міжнародны алімпійскі камітэт пакуль не збіраецца адмяняць або пераносіць галоўную спартыўную падзею гэтага года і заклікае ўсіх спартсменаў працягваць рыхтавацца да Токіа-2020. У сувязі з гэтым сёння ўспомнім самыя нечаканыя падзеі ў гісторыі чалавецтва, звязаныя з Алімпійскімі гульнямі.

АДМЕНЫ БЫЛО ДЗВЕ

Адмяняць Алімпійскія гульні даводзілася толькі двойчы ў гісторыі, гэта было звязана з сусветнымі войнамі. Алімпіяда ў Старажытнай Грэцыі была асаблівым святам. Падчас яе правядзення грэкі аб'яўлялі экехірыю — перамір'е. На тэрыторыі ўсёй Грэцыі забараняліся ваенныя дзеянні, а ўсе наймацнейшыя эліны з'язджаліся ў Алімпію для ўдзелу ў спаборніцтвах. Але ў XX стагоддзі Алімпійскія гульні ўжо не мелі такога магутнага ўплыву на дзяржаву, як гэта было ў старажытныя часы.

VI летнія Алімпійскія гульні па рашэнні МАК, прынятым 27 мая 1912 года, павінны былі адбыцца ў 1916 годзе. Права іх правядзення выйграў Берлін, перамогшы іншых прэтэндэнтаў: Александрыю, Амстэрдам, Брусель, Будапешт і Кліўленд. Нямецкі ўрад выдзеліў для іх правядзення 300 тысяч марак. У 1913 годзе немцы завяршылі будаўніцтва Алімпійскага стадыёна (DeutschesStadion). Але ўсё змянілася ў канцы ліпеня 1914 года. 28 чэрвеня ў Сараеве сербскі тэрарыст забіў нашчадка аўстра-венгерскага трона эрцгерцага Франца-Фердынанда і гэтым паклаў пачатак працэсу, які прывёў да краху не толькі берлінскай Алімпіяды, але і чатырох імперый. На працягу 1914 і 1915 гадоў 33 краіны свету былі ўцягнутыя ў Першую сусветную вайну.

МАК аказаўся ў неверагодна цяжкай сітуацыі. Большасць яго членаў таго часу было грамадзянамі краін, якія знаходзіліся ў стане вайны. Германія, нягледзячы ні на што, працягвала падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў і, відавочна, не збіралася камусьці аддаваць права на іх правядзенне. Некаторыя члены МАК прапаноўвалі перанесці Алімпіяду ў іншы горад, у якасці аднаго з прэтэндэнтаў разглядаўся Нью-Ёрк. Але ў рэшце рэшт было вырашана: падчас вайны Алімпійскія гульні праводзіцца не павінны.

XII летнія Алімпійскія гульні павінны былі праходзіць з 21 верасня да 6 кастрычніка 1940 года, таксама, дарэчы, у сталіцы Японіі. Аднак у сувязі з пачаткам у 1937 годзе Другой японска-кітайскай вайны Японія адмовілася ад гэтага гонару. 16 ліпеня 1938 года МАК прыняў рашэнне аддаць Алімпіяду сталіцы Фінляндыі Хельсінкі, дзе яе правядзенне было запланавана з 20 ліпеня да 4 жніўня. Але ў верасні 1939 года ваенныя дзеянні разгарнуліся на тэрыторыі амаль усёй Еўропы, пасля чаго МАК вымушаны быў прызнаць, што гульні дванаццатай летняй Алімпіяды не адбудуцца. Спаборніцтвы былі адсунутыя на нявызначаны тэрмін. Нягледзячы на адмену Гульняў, ім, як і не здзейсненым у 1916 годзе VI летнім Алімпійскім гульням, быў прысвоены свой парадкавы нумар.

КАЛІ ІТАЛІЯ БЫЛА Ў АГНІ

Міжнародны алімпійскі камітэт у 1904 годзе абраў італьянскі Рым месцам правядзення Алімпіяды-1908 — гэтую ідэю падтрымаў і сам Папа Рымскі

Пій X, цудатворац і будучы святы. Кіраўнікі Рыма таксама былі «за», прадчуваючы прыток інвестыцый, але іншыя італьянскія рэгіёны заявілі, што ў маладой на той момант краіны ёсць важнейшыя праблемы. Аднак у спрэчкі палітыкаў умяшалася прырода, а менавіта вядомы вулкан Везувій, вывяржэнне якога пачалося ў 1906 годзе. Гіганцкія валуны попелу і каменю зносілі дамы і цэрквы. Для аднаўлення спаленых наваколляў Неапаля запатрабаваліся велізарныя выдаткі. Італія афіцыйна і на добрапрыстойнай падставе адмовілася ад Алімпіяды за паўтара года да яе старту. Турнір з гатоўнасцю прыняў Лондан.

НАРОД СУПРАЦЬ

XII зімовыя Алімпійскія гульні ўвайшлі ў гісторыю як самы буйны арганізацыйны скандал. Амерыканскі горад Дэнвер, які заваяваў права прыняць у сябе Алімпіяду 1976 года, ужо атрымаўшы яго, адмовіўся ад правядзення Гульняў. Віной усяму была ініцыятыва дэпутата мясцовага штата Каларада Дзіка Лам. Ён выступіў за правядзенне рэферэндуму аб адмене Гульняў у сувязі з павелічэннем падатковай нагрузкі на мясцовы бізнес і насельніцтва штата. У выніку большасць выбаршчыкаў прагаласавала супраць дадатковага фінансавання Гульняў з мясцовага бюджэту. У Міжнароднага алімпійскага камітэта лішніх сродкаў не тое каб не аказалася, ён іх проста і шукаць не стаў. Замест гэтага пачаліся хуткія пошукі іншага месца для правядзення Алімпіяды. Паступілі тры заяўкі — ад Інсбрука, французскага Шамані і амерыканскага Лэйк-Плэсіда. Перамаглі аўстрыйцы: інфраструктура гарналыжнага курорта і наваколля Інсбрука — адна з найлепшых у свеце, і да таго ж гэты горад ужо прымаў Гульні за 12 гадоў да таго — у 1964 годзе.

КАРАНЦІН ДЛЯ КОНЕЙ

Летнюю Алімпіяду 1956 года цалкам пераносіць не давялося, але ўзнікла праблема з самым арыстакратычным відам — конным спортам. У Аўстраліі ўнікальная экасістэма, і там заўсёды вельмі клапаціліся пра тое, каб яе захаваць. Жорсткія каранцінныя меры таго часу патрабавалі трымаць на працяглым каранціне (да шасці месяцаў) жывёлу, што ўвозіцца на аўстралійскую тэрыторыю. У тым ліку спартыўных коней. Але ўсім вядома, што гэтым «атлетам» патрэбен штодзённы асаблівы догляд, і нават простая транспарціроўка на вялікую адлегласць выклікала вялізныя праблемы. Адпраўляць улюбёнцаў на каранцін наезнікі не сталі. Замест гэтага турнір па конным спорце перанеслі ў іншую краіну. Пацешна, што МАК не знайшоў іншага месца, акрамя Стакгольма, што зусім не блізка ад Аўстраліі. Дарэчы, тады шведскія коннікі заваявалі тры «залаты» з шасці магчымых.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

У тэму

Алімпіяда — адно з самых дарагіх мерапрыемстваў нашай цывілізацыі. На падрыхтоўку да Токіа-2020 Японія ўжо выдаткавала 12 мільярдаў долараў. Пабудаваны стадыёны, трасы і фан-зоны, заключаны камерцыйныя і рэкламныя кантракты, прададзены мільёны білетаў, забраніраваны мільёны нумароў у атэлях. Лічыцца, што ў выпадку беззваротнай адмены Алімпіяды Японія страціць каля 75 мільярдаў долараў, а яе ВУП скароціцца на 1,4 працэнта.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский радиозавод», 8 (0232) 21 60 07

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, руб. с НДС	Сумма задатка, руб.
1	Обрабатывающий центр CW1000 с инв. № 2067, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9	12 000,00	1 200,00
2	Координатно-расточной станок BRoZ 900x1400/5 с инв. № 1418, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9	10 000,00	1 000,00
3	Станок консольно-фрезерный вертикальный 6М13П с инв. № 735, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9	4 000,00	400,00
4	Станок токарно-винторезный 250ИТВМ01 инв. № 2323, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9	4 000,00	400,00

Срок и место подачи заявления	**по 20 апреля 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**22 апреля 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 21.03.2020 г.
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь по продаже земельных участков

№ лота	Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Начальная цена предмета аукциона (BYN)	Расход. по подг. земел.-кадастр. док. (BYN)	Сумма задатка (BYN)	Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке в связи с его расположением
1	г. Жабинка, ул. Дачная, 25	122550100001002736	0,1447	11 170,84	959,82	2 200,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хоз.-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Жабинка) на всей площади; - в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0043 га
2	г. Жабинка, ул. Курпичская, 72	122580604601000104	0,1426	4 071,87	997,99	800,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хоз.-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне прудов рыбхоза Соколово) на всей площади; - в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0001 га
3	г. Жабинка, ул. Приозерная, 4	122550100001002609	0,1303	9 277,36	563,68	1 800,00	- в водоохранной зоне пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади
4	г. Жабинка, ул. Приозерная, 6	122550100001002610	0,1262	8 985,44	563,68	1 700,00	- в водоохранной зоне пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади
5	г. Жабинка, ул. Приозерная, 8	122550100001002611	0,1265	9 006,80	563,33	1 800,00	- в водоохранной зоне пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади
6	Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Гагарина, 3	122581502601000265	0,2478	14 253,21	1 619,53	2800,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади
7	Ленинский с/с, д. Шелухи, ул. Центральная, 26	122581505601000028	0,2080	1 830,40	1 597,12	300,00	ограничений в использовании земель нет
8*	Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 45Г	122581505101000191	0,2500	4 550,00	1 587,97	900,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона р.Тростяница) на всей площади; - в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0025 га; - на мелиоративных землях на площади 0,1920 га
9	Хмелевский с/с, аг. Хмелево, ул. Озерная, 1А	122583605101000269	0,2499	4 109,61	2 007,40	800,00	- на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - охранная зона связи и радиофикации на площади 0,0168 га
10	Ракитницкий с/с, д. Бульково, ул. Чапаева, 42	122582400601000245	0,2009	2 977,34	1 864,82	500,00	ограничений в использовании земель нет
11	Ракитницкий с/с, х. Стриганецкие Бусни, 3А	122582404101000034	0,2491	1 644,06	1 951,10	300,00	- охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0004 га

Целевое назначение использования участков **– строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома**

*** Победитель аукциона, либо единственный участник несостоявшегося аукциона *обязан возместить убытки в сумме 1171,20 руб., связанных с нарушением функционирования мелиоративных сооружений***

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 – **2 700,00 рубля**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»	задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с №BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000

Земельный участок предоставляется в частную собственность победителю аукциона, либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона **победителем аукциона** или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся **единственным участником несостоявшегося аукциона**:

- внесения платы за земельный участок на расчетный счет соответствующего сельского (районного) исполнительного комитета;

• возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;

• компенсирования организатору аукциона затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• обращения победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок после подписания протокола о результатах аукциона или признания аукциона продажи несостоявшимся, за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

• получения победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке и сроки технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

• занятия (освоения) победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года после государственной регистрации права на него;

• до начала строительства снятия победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его для благоустройства участка

Аукцион состоится 22 апреля 2020 г. в 10.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 23.03.2020 г. до 17.00 16.04.2020 г. (время работы с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Жабинка, ул. Свободы, 6а. Контактные телефоны: 8 (01641) 32337, 8 (01641) 32546. Сайт: www.gki.gov.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Строительство группы жилых домов (3 пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика.

Информация о застройщике:

общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации:

в течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района:

- жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2015 г. – март 2016 г.;

- жилой дом № 1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: сентябрь 2015 г. – июнь 2017 г.;

- жилой дом №21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2017 г. – октябрь 2018 г.;

- жилой дом № 5 по Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: апрель 2018 г. – июнь 2019 г.

Информация об объекте строительства:

Цели строительства – строительство жилого дома в составе объекта «Строительство группы жилых домов (3 пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой» в д. Копище Минского района.

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:

начало строительства – май 2018 года**;**

окончание строительства – август 2020 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации:

положительное заключение государственной экспертизы от 23 марта 2018 г. № 241-70/18, выданное дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по Минской области».

Сведения о месте нахождения объекта строительства:

местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище; микрорайон № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района.

Характеристика объекта строительства:

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома № 35 по генплану (далее – жилой дом) в составе третьего пускового комплекса микрорайона № 1 Жилого района «Копище» по индивидуальному проекту.

В соответствие с определением, приведенном в Указе Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667, здание жилого дома относится к домам типовых потребительских качеств.

Жилой дом – здание 148-квартирного жилого дома, 25-этажное, односекционное с подвалом и техническим «теплым» чердаком. На первом этаже размещены встроенные помещения административного назначения с отдельными входами. В уровне подвала размещен встроенно-пристроенный гараж-стоянка на 46 машино-мест. Жилой дом расположен вдоль ул. Подгорная. Заезд к жилому дому осуществляется с ул. Лопатина. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

